СПЕЦВЫПУСК ДЛЯ АБІТУРЫЕНТАЎ

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Газета Беларускага дзяржаўнага універсітэта, 1999 год, № 5 (1797)

## ЗАПРАШАЕ БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ



*СТАРШЫНЯ ПРЫЁМНАЙ КАМІСІІ, РЭКТАР БЕЛДЗЯРЖУНІВЕРСІТЭТА ПРАФЕСАР* ***Аляксандр Уладзіслававіч КАЗУЛІН:***

*– Беларускі дзяржаўны універсітэт – старэйшы класічны універсітэт нашай краіны. У кастрычніку 1921 года прайшло залічэнне першых студэнтаў на тры яго факультэты, а ў лютым 1925 года адбыўся выпуск 26 юрыстаў і 34 эканамістаў. За гады свайго існавання універсітэт падрыхтаваў звыш 150 тысяч спецыялістаў, многія з якіх унеслі вялікі ўклад у развіццё не толькі нацыянальнай, але і сусветнай навукі і культуры, адыгралі значную ролю ва ўмацаванні беларускай дзяржаўнасці і эканамічнага патэнцыялу краіны. Сёння наш універсітэт – буйная навучальная ўстанова, якая арганічна спалучае ў сабе якасці адукацыйнага, навукова-вытворчага і культурнага цэнтра.*

*Вышэйшую адукацыю ва універсітэце па 38 спецыяльнасцях можна атрымаць на 15 факультэтах. Яшчэ на двух факультэтах ажыццяўляецца перападрыхтоўка кадраў і павышэнне кваліфікацыі ў галіне інфармацыйных тэхналогій, прыкладной матэматыкі і бізнесу, на адным – падрыхтоўка магістраў у галіне менеджменту навукаваёмістых тэхналогій з ліку асоб, якія маюць вышэйшую адукацыю. Эфектыўна працуюць два падрыхтоўчыя факультэты і ліцэй, большасць выпускнікоў якіх становяцца студэнтамі БДУ. У гэтым годзе ствараецца эканамічны факультэт, упершыню ўводзіцца падрыхтоўка спецыялістаў па эканоміцы, мытнай справе, літаратурнай рабоце, геаінфармацыйных сістэмах. У склад універсітэта сёння ўваходзяць таксама Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы, Інстытут перападрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі суддзяў, работнікаў пракуратуры, судоў і ўстаноў юстыцыі, тры буйныя навукова-даследчыя інстытуты, вучэбна-навукова-вытворчае аб'яднанне, нацыянальны навукова-вучэбны цэнтр фізікі часціц і высокіх энергій, нацыянальны навукова-даследчы цэнтр маніторынгу азонасферы, цэнтры сацыялагічных і палітычных даследаванняў, маркетынгавых даследаванняў, праблем развіцця адукацыі, навукова-інжынерны, інфармацыйных тэхналогій, малатаннажнай хіміі, шэраг навукова-даследчых лабараторый і доследных станцый.*

**(Заканчэнне на 2-й стар.).**

***Руслан Рыгоравіч МАКАРСКІ,***
*НАМЕСНІК СТАРШЫНІ СТУДЭНЦКАГА САЮЗА БЕЛДЗЯРЖУНІВЕРСІТЭТА:*



— Мы ўжо два гады займаемся каардынацыяй працы маладзёжных арганізацый у нашым універсітэце і ведаем усе праблемы, якія ўзнікаюць ці могуць узнікнуць у студэнтаў. Але асноўнае — гэта тое, што мы ведаем, як іх вырашаць. У гэтым годзе, як, дарэчы, было і раней, Студэнцкі саюз будзе ўдзельнічаць у грамадскай прыёмнай камісіі, што азначае дадатковыя гарантыі аб'ектыўнай ацэнкі ведаў абітурыентаў пры паступленні ў Белдзяржуніверсітэт.

Універсітэт разгортвае сваю работу і за межамі традыцыйнай сферы дзейнасці ВНУ: мы дапамагаем школам, дзіцячым дамам, супрацоўнічаем з ветэранскімі арганізацыямі. Паступіўшы ва універсітэт, і вы зможаце далучыцца да гэтай дзейнасці.

***Ігар Раманавіч ВЯРЭНЧЫКАЎ,***
*ДЫРЭКТАР СТУДЭНЦКАГА ГАРАДКА БЕЛДЗЯРЖУНІВЕРСІТЭТА:*



— Многіх іншагародніх студэнтаў пры паступленні ў Белдзяржуніверсітэт хвалюе праблема пражывання падчас уступных экзаменаў. Я з упэўненасцю магу сказаць, што Белдзяржуніверсітэт дасць усім сваім абітурыентам інтэрнат. У студэнцкім гарадку таксама працуе некалькі сталовых, дзе абітурыенты могуць добра паабедаць па студэнцкіх цэнах. Інфармацыю пра засяленне можна атрымаць у прыёмнай камісіі.

# ЗАПРАШАЕ БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).***

*На ўсіх формах навучання займаецца каля 16500 студэнтаў. Вучэбную работу з імі вядуць звыш 1850 выкладчыкаў, у тым ліку 235 прафесараў, звыш 850 дацэнтаў. Свой багаты навуковы і педагагічны вопыт перадаюць моладзі акадэмікі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі М.М. Аляхновіч, Я.М. Бабосаў, І.Дз. Валатоўскі, І.В. Гайшун, Р.Г. Гарэцкі, В.М. Гурын, М.А. Ізобаў, М.П. Касцюк, Ф.М. Капуцкі, А.І. Леснікові. А.С. Рубанаў, А.Р. Мартыненка, В.В. Свірыдаў, А.Ф. Чарняўскі і іншыя.*

*Кожны сучасны малады чалавек павінен усведамляць, што ўжо сёння, а тым больш у наступным тысячагоддзі, найбольш каштоўным капіталам любой асобы будуць трывалыя прафесійныя і агульнаадукацыйныя веды. Навучальны працэс ва універсітэце якраз і скіраваны на тое, каб нашы выпускнікі разам з авалоданнем глыбокімі спецыяльнымі ведамі маглі кваліфікавана выкарыстоўваць інфармацыйныя тэхналогіі, дасканала валодалі замежнымі мовамі, умелі прымаць аптымальныя рашэнні пры выкананні службовых і грамадскіх абавязкаў. Прэстыжнасць універсітэцкай адукацыі пацвярджаецца тым, што дыпломы Белдзяржуніверсітэта знаходзяць прызнанне ў многіх краінах свету. Па абсалютнай большасці спецыяльнасцей у апошні час назіраецца значнае павелічэнне конкурсу.*

*На старэйшых курсах студэнтам прадастаўляецца магчымасць выбару спецыялізацыі навучання, якіх сёння звыш 180. Асаблівасцю навучання ва універсітэце з'яўляецца шырокае прыцягненне студэнтаў да ўдзелу ў навукова-даследчай рабоце, дасягненні ў якой даюць магчымасць паступлення ў магістратуру або аспірантуру. Сёння па 95 спецыяльнасцях вядзецца падрыхтоўка кадраў вышэйшай кваліфікацыі праз аспірантуру і дактарантуру.*

*У БДУ дзейнічаюць 23 саветы па абароне доктарскіх і кандыдацкіх дысертацый.*

*У цэнтры ўвагі нашай дзейнасці знаходзіцца і ўмацаванне міжнароднага супрацоўніцтва ў галіне адукацыі і навукі. БДУ мае пагадненні аб супрацоўніцтве больш чым з 50 замежнымі універсітэтамі, узаемадзейнічае з такімі аўтарытэтнымі міжнароднымі арганізацыямі, як ААН, АБСЕ, Еўрапейскі Саюз. Штогод на падрыхтоўчым і асноўных факультэтах, у магістратуры, аспірантуры і дактарантуры навучаюцца або праходзяць стажыроўку каля 600 замежных грамадзян больш чым з 40 краін свету. Выпускнікі факультэта перападрыхтоўкі кадраў па менеджменту тэхналогій атрымліваюць сумесны беларуска-амерыканскі дыплом. Многія студэнты накіроўваюцца для навучання ў замежныя універсітэты.*

*Ва універсітэце створаны добрыя ўмовы для працы і адпачынку. Студэнты жывуць у добраўпарадкаваных інтэрнатах, да іх паслуг – санаторый-прафілакторый, басейн, стадыён, спартыўныя залы.*

*Гонарам універсітэта з'яўляюцца мастацкія творчыя калектывы – ансамбль танца "Крыжачок", фальклорна-этнаграфічны ансамбль "Неруш", акадэмічны хор студэнтаў, аркестр народных інструментаў, студэнцкі тэатр, тэатр эстрады, хор народнай песні. Вялікай папулярнасцю карыстаецца ў студэнтаў і выкладчыкаў каманда КВЗ, знаёмая ўсім па шматлікіх тэлевізійных перадачах.*

*Дарагія абітурыенты! Прыёмная камісія Белдзяржуніверсітэта накіроўвае ўсе свае намаганні на тое, каб найбольш таленавітыя і падрыхтаваныя з вас атрымалі права на студэнцкі білет. А поспехаў жадае ўсім.*

***Уладзімір Барысавіч АДЖАЕЎ,***
*НАМЕСНІК СТАРШЫНІ ПРЫЁМНАЙ КАМІСІІ:*



— У гэтым годзе Беларускі дзяржаўны універсітэт ажыццяўляе ўжо 79-ы набор першакурснікаў. Сотні маладых людзей стануць членамі вялікай, вясёлай і дружнай сям'і студэнцтва. Па сабе ведаю, што пяць гадоў, праведзеныя ва універсітэце, — самая лепшая пара ў жыцці. Зразумела, вучоба патрабуе шмат часу і намаганняў. Таму мы чакаем, што дзверы вядучай ВНУ Рэспублікі Беларусь адкрыюцца перш за ўсё для лепшых выпускнікоў школ, таленавітай моладзі. Хтосьці з іх ужо забяспечыў сабе месца на студэнцкай лаве перамогай у алімпіядах.

Ужо другі год прыём у БДУ будзе ажыццяўляцца па асаблівай схеме. Уступныя экзамены пройдуць раней, чым у іншых ВНУ рэспублікі, што дасць магчымасць абітурыентам, якія не зусім паспяхова прайшлі выпрабаванні ў Белдзяржуніверсітэце, паспрабаваць свае сілы яшчэ раз у іншым універсітэце, акадэміі альбо інстытуце.

Белдзяржуніверсітэт практычна кожны год пашырае колькасць спецыяльнасцей, па якіх рыхтуюць студэнтаў. Так, у гэтым годзе адкрыты новы эканамічны факультэт.

Канешне, для правільнага выбару месца і накірунку навучання, а значыць, і сваёй будучай прафесіі, неабходна аб'ектыўная інфармацыя аб універсітэце, аб яго факультэтах. Традыцыйна мы праводзім дні адчыненых дзвярэй. Акрамя таго, у гэтым годзе ўпершыню створана грамадская прыёмная камісія, якая будзе займацца інфармацыйнай і кансультацыйнай, а таксама іншай дапамогай абітурыентам, што, спадзяюся, дазволіць зняць хваляванне і нервовае напружанне ў паступаючых.

Напрыканцы хацеў бы пажадаць усім абітурыентам поспехаў, трывання і працавітасці, дзякуючы якім яны ўжо ўвосень змогуць з гонарам называць сябе студэнтамі БДУ.

***Віктар Васільевіч САМАХВАЛ,***
*АДКАЗНЫ САКРАТАР ПРЫЁМНАЙ КАМІСІІ:*



— Сакратарыят прыёмнай камісіі задоўга да пачатку ўступных экзаменаў рыхтуецца да сустрэчы з абітурыентамі. Члены сакратарыята бачаць сваю задачу не толькі ў правільным афармленні асабістых спраў абітурыентаў і іншых дакументаў прыёмнай камісіі, але і ў дапамозе ў выбары факультэта і спецыяльнасці, у правядзенні арганізацыйных мерапрыемстваў па стварэнні роўных магчымасцей для абітурыентаў на ўступных экзаменах. Вы можаце заўважыць, што дзеля гэтага многія экзамены, якія раней прымаліся ў вуснай форме, зараз прымаюцца пісьмова. Робіцца і многае іншае, каб кожны абітурыент адчуваў сябе ўтульна і ўпэўнена.

У сувязі са сціслымі тэрмінамі прыёму дакументаў ва універсітэце паступаючым неабходна загадзя паклапаціцца аб атрыманні пашпарта, медыцынскай даведкі і іншых дакументаў, якія пацвярджаюць тыя або іншыя ільготы на залічэнне, калі такія маюцца ў адпаведнасці з дзеючымі правіламі прыёму. Уважліва сачыце за аб'явамі прыёмнай камісіі і не памыляйцеся пры перапісванні раскладу кансультацый і ўступных экзаменаў. Усё гэта дазволіць вам пазбегнуць непатрэбных хваляванняў пры паступленні ва універсітэт.

# ПРАВІЛЫ ПРЫЁМУ
## У БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ НА 1999 ГОД

1. Для атрымання бясплатнай першай вышэйшай адукацыі ў Белдзяржуніверсітэт прымаюцца на конкурснай аснове асобы з сярэдняй адукацыяй, якія:

а) пастаянна пражываюць на тэрыторыі рэспублікі;

б) грамадзяне Беларусі і беларусы, якія пражываюць за яе межамі;

в) грамадзяне Расійскай Федэрацыі.

Грамадзяне іншых замежных дзяржаў прымаюцца ў Белдзяржуніверсітэт на платнай аснове па выніках тэсціравання, калі іншае не прадугледжана міждзяржаўнымі пагадненнямі.

2. На платнае навучанне па ўсіх спецыяльнасцях звыш кантрольных лічбаў прыёму, фінансуемых за кошт бюджэтных сродкаў, прымаюцца асобы, якія:

а) станоўча вытрымалі ўсе ўступныя выпрабаванні, але не прайшлі па конкурсе на бюджэтныя месцы;

б) выказалі жаданне паступаць у Белдзяржуніверсітэт па выніках тэсціравання з правам атрымання на працягу першага года навучання індывідуальных кансультацый без дадатковай аплаты.

Колькасць месцаў на платнай форме навучання па кожнай спецыяльнасці для гэтых катэгорый абітурыентаў вызначаецца ў залежнасці ад наяўнай вучэбна-лабараторнай базы, прафесарска-выкладчыцкага саставу і зацвярджаецца адпаведным загадам рэктара Белдзяржуніверсітэта.

Залічэнне на платнае навучанне праводзіцца па конкурсе ў адпаведнасці з колькасцю месцаў, выдзеленых для кожнай з катэгорый абітурыентаў.

На спецыяльным факультэце кіравання і сацыяльных тэхналогій навучанне ажыццяўляецца толькі на платнай аснове.

Памер аплаты залежыць ад спецыяльнасці, формы навучання, падставы для залічэння. Кошт платнага навучання не перавышае фактычных затрат на падрыхтоўку спецыяліста і зацвярджаецца адпаведным загадам рэктара БДУ.

3. Паступаючыя ў Белдзяржуніверсітэт падаюць у прыёмную камісію ці дасылаюць па пошце наступныя дакументы: заяву на імя рэктара па адзінай форме; дакумент дзяржаўнага ўзору аб сярэдняй адукацыі ў арыгінале; 6 чорна-белых фотакартак памерам 3х4; медыцынскую даведку па форме 086У (выдадзеную не раней як 15 мая 1999 года). Працуючыя прадстаўляюць, акрамя таго, выпіску (копію) з працоўнай кніжкі, а асобы, якія знаходзяцца на ўліку ў службе занятасці насельніцтва, — дакумент, які аб гэтым сведчыць.

Абітурыенты, якія паступаюць не ў год атрымання сярэдняй адукацыі, абавязаны прадставіць дакументы (выпіска з працоўнай кніжкі, даведка службы занятасці насельніцтва, дыплом ці іншае), якія пацвярджаюць іх работу або вучобу ўсе папярэднія гады.

Пашпарт або іншае пасведчанне асобы, выдадзенае органамі Міністэрства ўнутраных спраў, прад'яўляецца абітурыентам асабіста.

4. Дакументы ад паступаючых на дзённую і завочную бюджэтныя формы навучання прымаюцца з 22 чэрвеня па 5 ліпеня. Уступныя выпрабаванні праводзяцца з 6 ліпеня па 20 ліпеня. Залічэнне ў склад студэнтаў на бюджэтнае навучанне — да 22 ліпеня. Пералік уступных выпрабаванняў па кожнай спецыяльнасці даецца ў дадатку 1.

Дакументы ад асоб, якія выказалі жаданне паступаць на платнае навучанне па выніках тэсціравання, прымаюцца з 22 чэрвеня па 24 жніўня. Тэсціраванне праводзіцца: 9—10 ліпеня, 19—20 ліпеня, 25—26 жніўня. Залічэнне ў склад студэнтаў на платнае навучанне — да 27 жніўня. Калі пасля чарговага этапа тэсціравання план прыёму па якой-небудзь спецыяльнасці будзе выкананы, то прыём дакументаў па гэтай спецыяльнасці спыняецца. Пералік дысцыплін, па якіх праводзіцца тэсціраванне, даецца ў дадатку 2.

5. Уступныя выпрабаванні праводзяцца па праграмах, якія складзены ў адпаведнасці з вучэбнымі праграмамі агульнай сярэдняй адукацыі і зацверджаны рэктарам БДУ.

Паступаючыя маюць права здаваць уступныя выпрабаванні па выбары на беларускай ці на рускай мове.

Абітурыенты спецыяльнасцей, па якіх прадугледжана магчымасць выбару выпрабавання (беларуская мова і літаратура або руская мова і літаратура, беларуская або руская мова), паведамляюць аб сваім выбары пры падачы дакументаў.

Уступныя выпрабаванні па замежнай (англійскай, французскай, нямецкай, іспанскай) мове абітурыенты могуць здаваць па выбары, незалежна ад таго, па якой замежнай мове яны былі атэставаны. Выключэннем з'яўляецца спецыяльнасць сучасныя замежныя (англійская, французская, нямецкая) мовы і літаратуры, пры паступленні на якую абітурыенты здаюць уступныя выпрабаванні па замежнай мове ў адпаведнасці з абранай спецыяльнасцю.

6. Абітурыенты, якія не з'явіліся на выпрабаванне без уважлівых прычын або атрымалі нездавальняючую адзнаку, да далейшых выпрабаванняў не дапускаюцца.

7. На дзённую форму навучання асобы, якія скончылі сярэднюю навучальную ўстанову з медалём, сярэднюю спецыяльную навучальную ўстанову або ПТВ (на аснове базавай школы з атрыманнем сярэдняй адукацыі) з дыпломам з адзнакай,

пры паступленні на

механіка-матэматычны факультэт (спецыяльнасці матэматыка, матэматычная электроніка*, камп'ютэрная матэматыка*, матэматычныя метады ў эканоміцы*, механіка); факультэт прыкладной матэматыкі і інфарматыкі (спецыяльнасці прыкладная матэматыка, інфарматыка, эканамічная кібернетыка, актуарная матэматыка); фізічны факультэт (спецыяльнасць фізіка); факультэт радыёфізікі і электронікі (спецыяльнасці радыёфізіка, фізічная электроніка, камерцыйная дзейнасць); хімічны факультэт (спецыяльнасці хімія, хімія лекавых злучэнняў**, хімічная экалогія**); біялагічны факультэт (спецыяльнасці біялогія, біятэхналогія***, экалогія) залічваюцца па выніках тэсціравання па дысцыпліне, якая прыведзена ў пераліку ўступных выпрабаванняў першай. Дакументы ад іх прымаюцца да 2 ліпеня ўключна, тэсціраванне — 4 ліпеня. Асобы, не залічаныя па выніках тэсціравання, здаюць адзін экзамен, які прыведзены ў пераліку першым. Пры атрыманні адзнакі «пяць» яны вызваляюцца ад астатніх экзаменаў, пры атрыманні іншых станоўчых адзнак — здаюць астатнія экзамены;

пры паступленні на

геаграфічны факультэт (спецыяльнасці геаграфія, геаграфічныя інфармацыйныя сістэмы****, геалогія і разведка карысных выкапняў, экалогія), гістарычны факультэт (спецыяльнасці гісторыя, музейная справа і ахова помнікаў гісторыі і культуры, гісторыка-архівазнаўства); філалагічны факультэт (спецыяльнасці беларуская мова і літаратура, руская мова і літаратура); спецыяльны факультэт кіравання і сацыяльных тэхналогій (спецыяльнасці правазнаўства, сацыяльная работа, менеджмент) здаюць адзін экзамен, які прыведзены ў пераліку ўступных выпрабаванняў першым. Пры атрыманні адзнакі «пяць» яны вызваляюцца ад астатніх экзаменаў, пры атрыманні іншых станоўчых адзнак — здаюць астатнія экзамены;

пры паступленні на

факультэт філасофіі і сацыяльных навук (спецыяльнасці філасофія, сацыялогія, інфармацыя і камунікацыя, псіхалогія); факультэт міжнародных адносін (спецыяльнасці міжнародныя адносіны, міжнароднае права, сусветная эканоміка і міжнародныя эканамічныя адносіны, менеджмент, мытная справа); юрыдычны факультэт (спецыяльнасці правазнаўства, паліталогія); факультэт журналістыкі (спецыяльнасці журналістыка, міжнародная журналістыка*****, інфармацыя і камунікацыя, літаратурная работа); эканамічны факультэт (спецыяльнасці эканамічная тэорыя, менеджмент, эканоміка); філалагічны факультэт (спецыяльнасці славянскія мовы і літаратуры, класічныя мовы і антычная літаратура, сучасныя замежныя мовы і літаратуры) здаюць усе экзамены.

8. Пры паступленні на завочную форму навучання на юрыдычны факультэт (спецыяльнасць правазнаўства) асобы, якія скончылі сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы па роднасных спецыяльнасцях з дыпломам з адзнакай і працуюць па атрыманай спецыяльнасці не менш за 6 месяцаў, залічваюцца па выніках тэсціравання па асновах права. Для выпускнікоў сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў 1999 года працоўны стаж не патрабуецца.

*(Заканчэнне на 4-й стар.).*

# ПРАВІЛЫ ПРЫЁМУ
## Ў БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ НА 1999 ГОД

(*Заканчэнне. Пачатак на 3-й стар.*).

Дакументы ад такіх асоб прымаюцца да 2 ліпеня ўключна, тэсціраванне — 4 ліпеня. Не залічаныя па выніках тэсціравання паступаюць на агульных падставах.

Асобы, якія скончылі сярэднюю спецыяльную навучальную ўстанову або ПТВ (на аснове базавай школы з атрыманнем сярэдняй адукацыі) з дыпломам з адзнакай па адпаведнай ці роднаснай спецыяльнасці, а таксама асобы, якія скончылі сярэднюю навучальную ўстанову з медалём і маюць стаж практычнай работы не менш за 6 месяцаў па адпаведнай ці роднаснай спецыяльнасці, пры паступленні на завочную форму навучання на механіка-матэматычны факультэт (спецыяльнасць матэматыка), біялагічны факультэт (спецыяльнасць біялогія), геаграфічны факультэт (спецыяльнасць геаграфія), гістарычны факультэт (спецыяльнасці гісторыя, музейная справа і ахова помнікаў гісторыі і культуры, гісторыка-архівазнаўства), філалагічны факультэт (беларуская мова і літаратура, руская мова і літаратура), спецыяльны факультэт кіравання і сацыяльных тэхналогій (спецыяльнасці правазнаўства, сацыяльная работа, менеджмент) здаюць адзін экзамен, які прыведзены ў пераліку ўступных выпрабаванняў першым. Пры атрыманні адзнакі «пяць» яны вызваляюцца ад астатніх экзаменаў, пры атрыманні іншых станоўчых адзнак — здаюць астатнія экзамены.

**9**. Выпускнікі ліцэя БДУ 1999 года, якія маюць у атэстаце толькі добрыя і выдатныя адзнакі, прымаюцца на ўмовах, прадугледжаных дадзенымі Правіламі прыёму для асоб, якія скончылі сярэднюю школу з залатым (сярэбраным) медалём.

Выпускнікі падрыхтоўчага аддзялення БДУ 1999 года пры паступленні на спецыяльнасці, якія адпавядаюць профілю іх навучання, залічваюцца па-за конкурсам пры ўмове атрымання на ўступных выпрабаваннях адзнак не ніжэй чым “чатыры”.

Пераможцы алімпіяд “Абітурыент БДУ”, праведзеных факультэтамі БДУ ў 1999 годзе, залічваюцца на гэтыя факультэты без уступных выпрабаванняў. Прызёры гэтых алімпіяд прымаюцца на ўмовах, прадугледжаных дадзенымі Правіламі прыёму для асоб, якія скончылі сярэднюю школу з залатым (сярэбраным) медалём. Колькасць пераможцаў і прызёраў вызначаецца рашэннем прыёмнай камісіі. Дакументы ад такіх асоб прымаюцца да 2 ліпеня ўключна.

Заключныя туры алімпіяд “Абітурыент БДУ” праводзяцца адпаведнымі прадметнымі экзаменацыйнымі камісіямі.

**10**. Пераможцы (1, 2, 3 месца) міжнародных і рэспубліканскіх алімпіяд выпускнікоў сярэдніх і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў, праведзеных Міністэрствам адукацыі ў 1998/99 навучальным годзе па агульнаадукацыйных прадметах, залічваюцца без уступных выпрабаванняў пры ўмове паступлення на адпаведныя спецыяльнасці. Пры паступленні на іншыя спецыяльнасці такія асобы вызваляюцца ад уступнага выпрабавання па гэтым прадмеце з выстаўленнем адзнакі «пяць».

Пераможцы (1, 2, 3 месца) абласных і Мінскага гарадскога тураў алімпіяд выпускнікоў сярэдніх навучальных устаноў, праведзеных органамі кіравання адукацыяй у 1998/99 навучальным годзе па агульнаадукацыйных прадметах, вызваляюцца ад уступнага выпрабавання па гэтым прадмеце з выстаўленнем адзнакі «пяць» па выпрабаванні, якое прыведзена ў пераліку першым, пры ўмове паступлення на адпаведныя спецыяльнасці. Пераможцам алімпіяд па астраноміі адзнака “пяць” выстаўляецца па фізіцы. Пераможцам абласных і Мінскага гарадскога тураў алімпіяд па замежных мовах ільготы не прадастаўляюцца.

Пералік агульнаадукацыйных прадметаў і адпаведных ім спецыяльнасцей у Белдзяржуніверсітэце даецца ў дадатку 3.

Дакументы ад пераможцаў міжнародных, рэспубліканскіх, абласных і Мінскага гарадскога тураў алімпіяд прымаюцца да 2 ліпеня ўключна.

**11**. Залічэнне ва універсітэт на бюджэтныя месцы праводзіцца па конкурсе ў адпаведнасці з колькасцю балаў, набраных абітурыентамі на ўступных выпрабаваннях. Выпускнікам сельскіх школ 1999 года пры паступленні на ўсе спецыяльнасці і формы навучання дадаткова налічваецца адзін бал.

Колькасць абітурыентаў, залічаных па выніках алімпіяд і выніках тэсціравання медалістаў і прыроўненых да іх асоб, не павінна перавышаць 2/3 ад кантрольных лічбаў прыёму па кожнай спецыяльнасці. Калі колькасць пераможцаў алімпіяд па якой-небудзь спецыяльнасці перавысіць 2/3 ад кантрольных лічбаў прыёму, перавага аддаецца ўладальнікам дыпломаў больш высокай ступені ці набраўшым на алімпіядзе большую колькасць балаў. У гэтым выпадку тэсціраванне медалістаў і прыроўненых да іх асоб па гэтай спецыяльнасці не праводзіцца.

На завочную форму навучання конкурс праводзіцца асобна сярод:

а) абітурыентаў, якія маюць сярэднюю спецыяльную ці сярэднюю прафесійна-тэхнічную адукацыю або стаж практычнай работы не менш за 6 месяцаў і паступаюць на адпаведныя ці роднасныя спецыяльнасці;

б) іншых асоб.

Колькасць бюджэтных месцаў, якія выдзяляюцца для кожнай з гэтых катэгорый, вызначаецца рашэннем прыёмнай камісіі.

**12**. Па-за конкурсам пры атрыманні станоўчых адзнак на ўступных выпрабаваннях пры паступленні на дзённую і завочную формы навучання залічваюцца:

а) воіны-інтэрнацыяналісты;

б) дзеці-сіроты і дзеці, што засталіся без апекі бацькоў;

в) дзеці з сем'яў ваеннаслужачых або рабочых і служачых, што займалі штатныя пасады ў воінскіх часцях, загінуўшых (памёршых) ці стаўшых інвалідамі ў час праходжання вайсковай службы або працы ў складзе савецкіх войск на тэрыторыі дзяржаў, дзе вяліся баявыя дзеянні, а таксама дзеці з сем'яў ваеннаслужачых, загінуўшых (памёршых) у мірны час пры праходжанні вайсковай службы;

г) дзеці з сем'яў асоб начальніцкага і радавога саставу органаў унутраных спраў, загінуўшых (памёршых) ці стаўшых інвалідамі пры выкананні службовых абавязкаў на тэрыторыі дзяржаў, дзе вяліся баявыя дзеянні, а таксама дзеці з сем'яў асоб начальніцкага і радавога саставу органаў унутраных спраў, загінуўшых (памёршых) у мірны час пры выкананні службовых абавязкаў;

д) інваліды I і II груп, якім у адпаведнасці з заключэннем медыка-рэабілітацыйных экспертных камісій не супрацьпаказана навучанне ў БДУ і якія могуць наведваць заняткі;

е) асобы, якія маюць ільготы ў адпаведнасці з арт. 18 Закона Рэспублікі Беларусь “Аб сацыяльнай абароне грамадзян, пацярпеўшых ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС”;

ж) суайчыннікі з іншых краін па рэкамендацыях беларускіх суполак і навучальных устаноў замежжа на спецыяльна выдзеленыя месцы.

**13**. Пры іншых роўных умовах пераважнае права на залічэнне пры паступленні на дзённае і завочнае навучанне маюць:

а) інваліды III групы пры адсутнасці медыцынскіх супрацьпаказанняў;

б) асобы, якія маюць ільготы ў адпаведнасці з арт. 19, 20, 23, 24, 25 Закона Рэспублікі Беларусь “Аб сацыяльнай абароне грамадзян, пацярпеўшых ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС”;

в) ваеннаслужачыя, звольненыя ў запас, якія маюць ільготы, устаноўленыя заканадаўствам, і рэкамендацыі воінскіх часцей;

г) выпускнікі ліцэя БДУ 1999 года;

д) выпускнікі Нацыянальнага дзяржаўнага гуманітарнага ліцэя імя Якуба Коласа 1999 года пры паступленні на адпаведныя спецыяльнасці;

е) асобы, якія маюць стаж практычнай работы не менш двух гадоў.

**14**. Атрыманне другой вышэйшай адукацыі ажыццяўляецца на ўмовах поўнай аплаты за навучанне. Парадак залічэння такіх асоб вызначаецца адпаведным Палажэннем.

**15**. Усе іншыя пытанні, звязаныя з прыёмам у БДУ, якія не адлюстраваны ў дадзеных Правілах, канчаткова вырашаюцца прыёмнай камісіяй.

*Заўвагі:*

* — спецыялізацыя спецыяльнасці матэматыка;

** — спецыялізацыя спецыяльнасці хімія;

*** — спецыялізацыя спецыяльнасці біялогія;

**** — спецыялізацыя спецыяльнасці геаграфія;

***** — спецыялізацыя спецыяльнасці журналістыка.

# ДАДАТАК 1

# ПЕРАЛІК УСТУПНЫХ ВЫПРАБАВАННЯЎ У БЕЛДЗЯРЖУНІВЕРСІТЭТ У 1999 ГОДЗЕ

| ФАКУЛЬТЭТЫ, СПЕЦЫЯЛЬНАСЦІ (СПЕЦЫЯЛІЗАЦЫІ) | УСТУПНЫЯ ВЫПРАБАВАННІ |
|---|---|
| МЕХАНІКА-МАТЭМАТЫЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ<br>1. Матэматыка<br>2. Матэматычная электроніка<br>3. Камп'ютэрная матэматыка<br>4. Матэматычныя метады ў эканоміцы<br>5. Механіка | 1. Матэматыка (вусна)<br>2. Матэматыка (пісьмова)<br>3. Беларуская мова або руская мова (пісьмовае тэсціраванне)<br>4. Замежная мова (вусна, для жадаючых, з атрыманнем пры станоўчай здачы аднаго дадатковага бала) |
| ФАКУЛЬТЭТ ПРЫКЛАДНОЙ МАТЭМАТЫКІ І ІНФАРМАТЫКІ<br>1. Прыкладная матэматыка<br>2. Інфарматыка<br>3. Эканамічная кібернетыка<br>4. Актуарная матэматыка | 1. Матэматыка (вусна)<br>2. Матэматыка (пісьмова)<br>3. Беларуская мова або руская мова (пісьмовае тэсціраванне)<br>4. Замежная мова (вусна, для жадаючых, з атрыманнем пры станоўчай здачы аднаго дадатковага бала) |
| ФАКУЛЬТЭТ РАДЫЁФІЗІКІ І ЭЛЕКТРОНІКІ<br>1. Радыёфізіка<br>2. Фізічная электроніка | 1. Фізіка (пісьмовае тэсціраванне)<br>2. Беларуская мова або руская мова (пісьмовае тэсціраванне) |
| 3. Камерцыйная дзейнасць (спецыялізацыя — камерцыйная дзейнасць на рынку радыёэлектронных сродкаў і інфармацыйных паслуг) | 1. Фізіка (пісьмовае тэсціраванне)<br>2. Беларуская мова або руская мова (пісьмовае тэсціраванне)<br>3. Замежная мова (вусна, для жадаючых, з атрыманнем пры станоўчай здачы аднаго дадатковага бала) |
| ФІЗІЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ<br>1. Фізіка | 1. Фізіка (пісьмовае тэсціраванне)<br>2. Беларуская мова або руская мова (пісьмовае тэсціраванне) |
| ХІМІЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ<br>1. Хімія<br>2. Хімія лекавых злучэнняў<br>3. Хімічная экалогія | 1. Хімія (вусна)<br>2. Матэматыка (пісьмова)<br>3. Беларуская мова або руская мова (пісьмовае тэсціраванне)<br>4. Замежная мова (вусна, для жадаючых, з атрыманнем пры станоўчай здачы аднаго дадатковага бала) |
| БІЯЛАГІЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ<br>1. Біялогія<br>2. Біятэхналогія<br>3. Экалогія | 1. Біялогія (пісьмова)<br>2. Хімія (вусна)<br>3. Беларуская мова або руская мова (пісьмовае тэсціраванне)<br>4. Замежная мова (вусна, для жадаючых, з атрыманнем пры станоўчай здачы аднаго дадатковага бала) |
| ГЕАГРАФІЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ<br>1. Геаграфія<br>2. Геаграфічныя інфармацыйныя сістэмы<br>3. Геалогія і разведка карысных выкапняў<br>4. Экалогія | 1. Геаграфія (вусна)<br>2. Матэматыка (пісьмова)<br>3. Беларуская мова або руская мова (пісьмовае тэсціраванне)<br>4. Замежная мова (вусна, для жадаючых, з атрыманнем пры станоўчай здачы аднаго дадатковага бала) |
| ГІСТАРЫЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ<br>1. Гісторыя<br>2. Музейная справа і ахова помнікаў гісторыі і культуры<br>3. Гісторыка-архівазнаўства | 1. Гісторыя Беларусі (вусна)<br>2. Сусветная гісторыя навейшага часу (пісьмова, на беларускай або рускай мове, з дзвюма адзнакамі — за змест і за пісьменнасць)<br>3. Замежная мова (вусна) |
| ФІЛАЛАГІЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ<br>1. Беларуская мова і літаратура | 1. Беларуская мова (пісьмовае тэсціраванне)<br>2. Беларуская літаратура (вусна, з тэставым заданнем)<br>3. Замежная мова (вусна) |
| 2. Руская мова і літаратура | 1. Руская мова (пісьмовае тэсціраванне)<br>2. Руская літаратура (вусна, з тэставым заданнем)<br>3. Замежная мова (вусна) |
| 3. Славянскія мовы і літаратуры | 1. Беларуская мова або руская мова (пісьмовае тэсціраванне)<br>2. Беларуская літаратура або руская літаратура (вусна, з тэставым заданнем)<br>3. Замежная мова (вусна) |
| 4. Класічныя мовы і антычная літаратура<br>5. Сучасныя замежныя мовы і літаратуры | 1. Замежная мова (вусна, з аўдзіраваннем)<br>2. Замежная мова (лексіка-граматычны тэст)<br>3. Беларуская літаратура або руская літаратура (вусна, з тэставым заданнем)<br>4. Беларуская мова або руская мова (пісьмовае тэсціраванне) |
| ФАКУЛЬТЭТ ФІЛАСОФІІ І САЦЫЯЛЬНЫХ НАВУК<br>1. Філасофія<br>2. Сацыялогія<br>3. Інфармацыя і камунікацыя | 1. Чалавек і грамадства (вусна)<br>2. Замежная мова (вусна)<br>3. Беларуская мова і літаратура або руская мова і літаратура (сачыненне) |
| 4. Псіхалогія | 1. Чалавек і грамадства (вусна)<br>2. Замежная мова (вусна)<br>3. Біялогія (вусна)<br>4. Беларуская мова і літаратура або руская мова і літаратура (сачыненне) |
| ФАКУЛЬТЭТ МІЖНАРОДНЫХ АДНОСІН<br>1. Міжнародныя адносіны | 1. Сусветная гісторыя навейшага часу (пісьмова)<br>2. Замежная мова (вусна, з лексіка-граматычным тэстам і аўдзіраваннем)<br>3. Геаграфія (вусна)<br>4. Беларуская мова і літаратура або руская мова і літаратура (сачыненне) |
| 2. Міжнароднае права | 1. Сусветная гісторыя навейшага часу (пісьмова)<br>2. Замежная мова (вусна, з лексіка-граматычным тэстам і аўдзіраваннем)<br>3. Чалавек і грамадства (вусна)<br>4. Беларуская мова і літаратура або руская мова і літаратура (сачыненне) |
| 3. Сусветная эканоміка і міжнародныя эканамічныя адносіны<br>4. Менеджмент (спецыялізацыя — менеджмент у сферы міжнароднага турызму)<br>5. Мытная справа | 1. Матэматыка (пісьмова)<br>2. Замежная мова (вусна, з лексіка-граматычным тэстам і аўдзіраваннем)<br>3. Геаграфія (вусна)<br>4. Беларуская мова і літаратура або руская мова і літаратура (сачыненне) |
| ФАКУЛЬТЭТ ЖУРНАЛІСТЫКІ<br>1. Журналістыка<br>2. Інфармацыя і камунікацыя<br>3. Літаратурная работа | 1. Творчае сачыненне (пісьмова, на беларускай або рускай мове, з дзвюма адзнакамі — за змест, веданне літаратурных крыніц і за пісьменнасць)<br>2. Замежная мова (вусна)<br>3. Чалавек і грамадства (вусна)<br>4. Творчае тэсціраванне (вусна, для жадаючых, з атрыманнем пры станоўчай здачы да аднаго дадатковага бала) |

| | |
|---|---|
| 4. Міжнародная журналістыка | 1. Творчае сачыненне (пісьмова, на беларускай або рускай мове, з дзвюма адзнакамі — за змест, веданне літаратурных крыніц і за пісьменнасць)<br>2. Замежная мова (вусна, з аўдзіраваннем)<br>3. Чалавек і грамадства (вусна)<br>4. Творчае тэсціраванне (вусна, для жадаючых, з атрыманнем пры станоўчай здачы да аднаго дадатковага бала) |
| ЮРЫДЫЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ<br>1. Палітапогія | 1. Чалавек і грамадства (вусна)<br>2. Замежная мова (вусна)<br>3. Беларуская мова і літаратура або руская мова і літаратура (сачыненне)<br>4. Сусветная гісторыя навейшага часу (пісьмова) |
| 2. Правазнаўства | 1. Чалавек і грамадства (вусна)<br>2. Замежная мова (вусна)<br>3. Беларуская мова або руская мова (пісьмовае тэсціраванне)<br>4. Матэматыка (пісьмова) |
| ЭКАНАМІЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ<br>1. Эканамічная тэорыя<br>2. Менеджмент<br>3. Эканоміка | 1. Матэматыка (пісьмова)<br>2. Чалавек і грамадства (вусна)<br>3. Беларуская мова або руская мова (пісьмовае тэсціраванне)<br>4. Замежная мова (вусна, з лексіка-граматычным тэстам і аўдзіраваннем) |
| СПЕЦЫЯЛЬНЫ ФАКУЛЬТЭТ КІРАВАННЯ І САЦЫЯЛЬНЫХ ТЭХНАЛОГІЙ<br>1. Правазнаўства (спецыялізацыя – прававое забеспячэнне бізнесу) | 1. Чалавек і грамадства (вусна)<br>2. Беларуская мова або руская мова (пісьмовае тэсціраванне)<br>3. Замежная мова (вусна)<br>4. Матэматыка (вуснае субяседаванне) |
| 2. Сацыяльная работа (спецыялізацыя – арганізацыя сацыяльна-псіхалагічнай дапамогі насельніцтву) | 1. Чалавек і грамадства (вусна)<br>2. Беларуская мова або руская мова (пісьмовае тэсціраванне)<br>3. Замежная мова (вусна) |
| 3. Менеджмент (спецыялізацыя – кіраванне персаналам прадпрыемстваў і працоўнымі рэсурсамі) | 1. Матэматыка (вусна)<br>2. Беларуская мова або руская мова (пісьмовае тэсціраванне)<br>3. Замежная мова (вусна) |

# ДАДАТАК 2

## ПЕРАЛІК ДЫСЦЫПЛІН, ПА ЯКІХ ПРАВОДЗІЦЦА ТЭСЦІРАВАННЕ АБІТУРЫЕНТАЎ, ЯКІЯ ПАСТУПАЮЦЬ НА ПЛАТНАЕ НАВУЧАННЕ

| ФАКУЛЬТЭТЫ, СПЕЦЫЯЛЬНАСЦІ (СПЕЦЫЯЛІЗАЦЫІ) | ДЫСЦЫПЛІНЫ |
|---|---|
| МЕХАНІКА-МАТЭМАТЫЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ<br>1. Матэматыка<br>2. Матэматычная электроніка<br>3. Камп'ютэрная матэматыка<br>4. Матэматычныя метады ў эканоміцы<br>5. Механіка<br>ФАКУЛЬТЭТ ПРЫКЛАДНОЙ МАТЭМАТЫКІ І ІНФАРМАТЫКІ<br>1. Прыкладная матэматыка<br>2. Інфарматыка<br>3. Эканамічная кібернетыка<br>4. Актуарная матэматыка<br>ЭКАНАМІЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ<br>1. Эканамічная тэорыя<br>2. Менеджмент<br>3. Эканоміка<br>СПЕЦЫЯЛЬНЫ ФАКУЛЬТЭТ КІРАВАННЯ І САЦЫЯЛЬНЫХ ТЭХНАЛОГІЙ<br>1. Менеджмент | Матэматыка |
| ФІЗІЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ<br>1. Фізіка<br>ФАКУЛЬТЭТ РАДЫЁФІЗІКІ І ЭЛЕКТРОНІКІ<br>1. Радыёфізіка<br>2. Фізічная электроніка<br>3. Камерцыйная дзейнасць | Фізіка |
| ХІМІЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ<br>1. Хімія<br>2. Хімія лекавых злучэнняў<br>3. Хімічная экалогія | Хімія |
| ГІСТАРЫЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ<br>1. Гісторыя<br>2. Музейная справа і ахова помнікаў гісторыі і культуры<br>3. Гісторыка-архівазнаўства | Гісторыя Беларусі |
| БІЯЛАГІЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ<br>1. Біялогія<br>2. Біятэхналогія<br>3. Экалогія | Біялогія |
| ГЕАГРАФІЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ<br>1. Геаграфія<br>2. Геаграфічныя інфармацыйныя сістэмы<br>3. Геалогія і разведка карысных выкапняў<br>4. Экалогія | Геаграфія |
| ФІЛАЛАГІЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ<br>1. Беларуская мова і літаратура | Беларуская мова і літаратура |
| ФІЛАЛАГІЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ<br>1. Руская мова і літаратура | Руская мова і літаратура |
| ФІЛАЛАГІЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ<br>1. Славянскія мовы і літаратуры | Беларуская мова і літаратура або руская мова і літаратура |
| ФІЛАЛАГІЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ<br>1. Класічныя мовы і антычная літаратура<br>2. Сучасныя замежныя мовы і літаратуры | Замежная мова |
| СПЕЦЫЯЛЬНЫ ФАКУЛЬТЭТ КІРАВАННЯ І САЦЫЯЛЬНЫХ ТЭХНАЛОГІЙ<br>1. Правазнаўства<br>2. Сацыяльная работа | Чалавек і грамадства |
| ФАКУЛЬТЭТ МІЖНАРОДНЫХ АДНОСІН<br>1. Сусветная эканоміка і міжнародныя эканамічныя адносіны<br>2. Менеджмент<br>3. Мытная справа | Матэматыка<br>Замежная мова |
| ФАКУЛЬТЭТ МІЖНАРОДНЫХ АДНОСІН<br>1. Міжнародныя адносіны<br>2. Міжнароднае права | Сусветная гісторыя навейшага часу<br>Замежная мова |

| | |
|---|---|
| ФАКУЛЬТЭТ ФІЛАСОФІІ І САЦЫЯЛЬНЫХ НАВУК<br>1. Філасофія<br>2. Сацыялогія<br>3. Інфармацыя і камунікацыя<br>4. Псіхалогія | Чалавек і грамадства<br>Замежная мова |
| ЮРЫДЫЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ<br>1. Правазнаўства<br>2. Паліталогія<br>ФАКУЛЬТЭТ ЖУРНАЛІСТЫКІ<br>1. Журналістыка<br>2. Міжнародная журналістыка<br>3. Інфармацыя і камунікацыя<br>4. Літаратурная работа | Чалавек і грамадства<br>Замежная мова |

## ДАДАТАК 3

### ПЕРАЛІК АГУЛЬНААДУКАЦЫЙНЫХ ПРАДМЕТАЎ І АДПАВЕДНЫХ ІМ СПЕЦЫЯЛЬНАСЦЕЙ У БЕЛДЗЯРЖУНІВЕРСІТЭЦЕ

| АГУЛЬНААДУКАЦЫЙНЫЯ ПРАДМЕТЫ | ФАКУЛЬТЭТЫ, СПЕЦЫЯЛЬНАСЦІ (СПЕЦЫЯЛІЗАЦЫІ) |
|---|---|
| Матэматыка | МЕХАНІКА-МАТЭМАТЫЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ<br>1. Матэматыка<br>2. Матэматычная электроніка<br>3. Камп'ютэрная матэматыка<br>4. Матэматычныя метады ў эканоміцы<br>5. Механіка<br>ФАКУЛЬТЭТ ПРЫКЛАДНОЙ МАТЭМАТЫКІ І ІНФАРМАТЫКІ<br>1. Прыкладная матэматыка<br>2. Інфарматыка<br>3. Эканамічная кібернетыка<br>4. Актуарная матэматыка |
| Інфарматыка | ФАКУЛЬТЭТ ПРЫКЛАДНОЙ МАТЭМАТЫКІ І ІНФАРМАТЫКІ<br>1. Інфарматыка |
| Фізіка | ФІЗІЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ<br>1. Фізіка<br>ФАКУЛЬТЭТ РАДЫЁФІЗІКІ І ЭЛЕКТРОНІКІ<br>1. Радыёфізіка<br>2. Фізічная электроніка<br>3. Камерцыйная дзейнасць |
| Астраномія | ФІЗІЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ<br>1. Фізіка<br>ФАКУЛЬТЭТ РАДЫЁФІЗІКІ І ЭЛЕКТРОНІКІ<br>1. Радыёфізіка<br>2. Фізічная электроніка |
| Хімія | ХІМІЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ<br>1. Хімія<br>2. Хімія лекавых злучэнняў<br>3. Хімічная экалогія |
| Біялогія | БІЯЛАГІЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ<br>1. Біялогія<br>2. Біятэхналогія<br>3. Экалогія |
| Беларуская мова і літаратура | ФІЛАЛАГІЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ<br>1. Беларуская мова і літаратура |
| Руская мова і літаратура | ФІЛАЛАГІЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ<br>1. Руская мова і літаратура |
| Геаграфія | ГЕАГРАФІЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ<br>1. Геаграфія<br>2. Геаграфічныя інфармацыйныя сістэмы<br>3. Геалогія і разведка карысных выкапняў<br>4. Экалогія |
| Гісторыя | ГІСТАРЫЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ<br>1. Гісторыя<br>2. Музейная справа і ахова помнікаў гісторыі і культуры<br>3. Гісторыка-архівазнаўства |
| Замежныя мовы | ФІЛАЛАГІЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ<br>1. Сучасныя замежныя мовы і літаратуры |

# ЗВЕСТКІ АБ КОНКУРСАХ І ПРАХАДНЫХ БАЛАХ У БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ У 1998 ГОДЗЕ

| Спецыяльнасць | Конкурс | Прахадны бал |
|---|---|---|
| Матэматыка | 2.45 | 13 з 16 |
| Матэматычная электроніка | 2.4 | 13 з 16 |
| Камп'ютэрная матэматыка | 3.6 | 13 з 16 |
| Матэматычныя метады ў эканоміцы | 3.15 | 11 з 16 |
| Механіка | 2.56 | 13 з 16 |
| Прыкладная матэматыка | 3.34 | 12.5 з 16 |
| Інфарматыка | 3.26 | 13 з 16 |
| Эканамічная кібернетыка | 2.1 | 11 з 16 |
| Актуарная матэматыка | 3.05 | * |
| Фізіка | 2.48 | 8.5 з 10 |
| Радыёфізіка | 2.14 | 8.5 з 10 |
| Фізічная электроніка | 2.52 | 9 з 10 |
| Камерцыйная дзейнасць | 3.47 | 9 з 10 |
| Хімія | 2.35 | 12 з 16 |
| Хімія лекавых злучэнняў | 3.52 | ** |
| Экалогія (хімічны факультэт) | 2.47 | 11 з 16 |
| Біялогія | 3.66 | 14 з 16 |
| Біятэхналогія | 3.5 | 13.5 з 16 |
| Экалогія (біялагічны факультэт) | 3.47 | ** |
| Геаграфія | 2.54 | 12.5 з 16 |
| Геалогія і разведка карысных выкапняў | 1.9 | 9 з 16 |
| Экалогія (геаграфічны факультэт) | 2.6 | 13 з 16 |
| Гісторыя | 3.33 | 18 з 20 |
| Гісторыка-архівазнаўства | 2.93 | 16 з 20 |
| Музейная справа і ахова помнікаў гісторыі і культуры | 3.2 | 16.5 з 20 |
| Філасофія | 4.9 | 14 з 15 |
| Сацыялогія | 6.65 | 14 з 15 |
| Псіхалогія | 3.72 | 16.5 з 20 |
| Інфармацыя і камунікацыя (філасофска-эканамічны факультэт) | 6.53 | 14 з 15 |
| Эканамічная тэорыя | 3.75 | 15 з 20 |
| Менеджмент (філасофска-эканамічны факультэт) | 4.65 | 15.5 з 20 |
| Журналістыка | 3.83 | 17.5 з 20 |
| Міжнародная журналістыка | 3.13 | 16 з 20 |
| Інфармацыя і камунікацыя (факультэт журналістыкі) | 4.2 | 17.5 з 20 |
| Беларуская мова і літаратура | 3.11 | 13.5 з 15 |
| Руская мова і літаратура | 3.1 | 13 з 15 |
| Славянскія мовы і літаратуры | 2.48 | * |
| Сучасная англійская мова і літаратура | 6.28 | 19 з 20 |
| Сучасная французская мова і літаратура | 2.8 | 15.5 з 20 |
| Сучасная нямецкая мова і літаратура | 3.67 | 17.5 з 20 |
| Сучасная італьянская мова і літаратура | 4.07 | 18 з 20 |
| Міжнародныя адносіны | 3.83 | 17 з 20 |
| Міжнароднае права | 3.88 | 17.5 з 20 |
| Сусветная эканоміка і міжнародныя эканамічныя адносіны | 4.04 | 17.5 з 20 |
| Менеджмент (факультэт міжнародных адносін) | 2.95 | 16 з 20 |
| Правазнаўства | 4.3 | 17 з 20 |
| Паліталогія | 3.75 | 16.5 з 20 |

* — залічаны толькі пераможцы алімпіяд

** — залічаны толькі пераможцы алімпіяд і медалісты

*Дадатак 1*
*да загада № 48-АД ад 03.03.1999 г.*

# ПЛАН ПРЫЁМУ НА І КУРС БЕЛДЗЯРЖУНІВЕРСІТЭТА У 1999 ГОДЗЕ (ДЗЁННАЯ ФОРМА НАВУЧАННЯ)

| Факультэт | Назва спецыяльнасці (спецыялізацыі) | Бюджэтнае навучанне | Платнае навучанне | |
|---|---|---|---|---|
| | | | па выніках экзаменаў | па выніках тэсціравання |
| Мехмат | Матэматыка | 80 | 5 | 1 |
| | Матэматычная электроніка | 25 | 5 | 1 |
| | Камп'ютэрная матэматыка | 20 | 5 | 1 |
| | Матэматычныя метады ў эканоміцы | 20 | 5 | 1 |
| | Механіка | 25 | 5 | 1 |
| ФПМІ | Прыкладная матэматыка | 85 | 10 | 5 |
| | Інфарматыка | 60 | 10 | 5 |
| | Эканамічная кібернетыка | 15 | 10 | 5 |
| | Актуарная матэматыка | 15 | 10 | 5 |
| Фізфак | Фізіка | 125 | 10 | 2 |
| ФРФЭ | Радыёфізіка | 60 | 5 | 5 |
| | Фізічная электроніка | 50 | 5 | 5 |
| | Камерцыйная дзейнасць | 15 | 10 | 5 |
| Хімфак | Хімія | 60 | 5 | 3 |
| | Хімія лекавых злучэнняў | 25 | 10 | 5 |
| | Хімічная экалогія | 15 | 5 | 2 |
| Біяфак | Біялогія | 65 | 24 | 6 |
| | Біятэхналогія | 20 | 6 | 4 |
| | Экалогія | 15 | 6 | 4 |
| Геафак | Геаграфія | 65 | 10 | 5 |
| | Геалогія і разведка карысных выкапняў | 15 | 3 | 2 |
| | Экалогія | 15 | 3 | 2 |
| | Геаграфічныя інфармацыйныя сістэмы | 15 | 5 | 5 |
| Гістфак | Гісторыя | 75 | 40 | 15 |
| | Гісторыка-архівазнаўства | 15 | 10 | 5 |
| | Музейная справа і ахова помнікаў гісторыі і культуры | 15 | 10 | 5 |
| ФФСН | Філасофія | 30 | 10 | 2 |
| | Сацыялогія | 20 | 10 | 2 |
| | Псіхалогія | 25 | 10 | 3 |
| | Інфармацыя і камунікацыя | 15 | 15 | 3 |
| ЭФ | Эканамічная тэорыя | 20 | 15 | 10 |
| | Менеджмент | 20 | 15 | 10 |
| | Эканоміка | 20 | 30 | 20 |
| Журфак | Журналістыка | 50 | 25 | 5 |
| | Міжнародная журналістыка | 15 | 10 | 5 |
| | Інфармацыя і камунікацыя | 15 | 10 | 5 |
| | Літаратурная работа | 15 | 10 | 5 |
| Філфак | Беларуская мова і літаратура | 80 | 15 | 3 |
| | Руская мова і літаратура | 50 | 10 | 2 |
| | Славянскія мовы і літаратуры | 15 | 3 | 2 |
| | Сучасная англійская мова і літаратура | 25 | 10 | 7 |
| | Сучасная французская мова і літаратура | 15 | 3 | 2 |
| | Сучасная нямецкая мова і літаратура | 15 | 3 | 2 |
| | Сучасная італьянская мова і літаратура | 15 | 5 | 5 |
| | Класічныя мовы і антычная літаратура | 10 | 2 | 3 |

*(Працяг табліцы на 9-й стар.).*

# ПРЫЁМНАЯ КАМІСІЯ БДУ-99

**Старшыня прыёмнай камісіі** — рэктар Белдзяржуніверсітэта прафесар Казулін Аляксандр Уладзіслававіч

**Намеснік старшыні** — прарэктар па вучэбна-выхаваўчай рабоце і сацыяльных пытаннях дацэнт Аджаеў Уладзімір Барысавіч

**Адказны сакратар** — начальнік упраўлення вучэбнай і навукова-метадычнай работы дацэнт Самахвал Віктар Васільевіч

**Адрас для паштовай карэспандэнцыі**: 220050, г. Мінск, праспект Ф. Скарыны, 4, Белдзяржуніверсітэт, прыёмная камісія (указаць спецыяльнасць).

**Сакратарыят прыёмнай камісіі** размяшчаецца ў геаграфічным корпусе БДУ (вул. Ленінградская, 12, пакой 123, тэл. 226-59-51).

**Прыём дакументаў** праводзіцца ў геаграфічным корпусе БДУ:

**аўдыторыя №121** — юрыдычны факультэт, хімічны факультэт, факультэт прыкладной матэматыкі і інфарматыкі, гістарычны факультэт, фізічны факультэт, эканамічны факультэт;

**аўдыторыя №218** — філалагічны факультэт, механіка-матэматычны факультэт, факультэт журналістыкі, факультэт міжнародных адносін, факультэт філасофіі і сацыяльных навук;

**аўдыторыя №221** — біялагічны факультэт;

**аўдыторыя №222** — геаграфічны факультэт, факультэт радыёфізікі і электронікі, спецфакультэт кіравання і сацыяльных тэхналогій.

**Графік работы** прыёмнай камісіі па прыёму дакументаў:

*панядзелак, аўторак, серада, чацвер, пятніца* — з 9 да 16 гадзін (перапынак на абед — з 12 да 13 гадзін)
*субота* — з 9 да 13 гадзін
*нядзеля* — выхадны дзень

**Прыём апеляцый** па пытаннях экзаменацыйных адзнак праводзіцца ў аўдыторыі № 127. Апеляцыі прымаюцца толькі ў дзень правядзення вуснага экзамена ці ў дзень абвяшчэння адзнак па пісьмовым экзамене.

## ПЛАН ПРЫЁМУ НА І КУРС БЕЛДЗЯРЖУНІВЕРСІТЭТА Ў 1999 ГОДЗЕ (ДЗЁННАЯ ФОРМА НАВУЧАННЯ)

*(Заканчэнне. Пачатак табліцы на 8-й стар.).*

| Факультэт | Назва спецыяльнасці (спецыялізацыі) | Бюджэтнае навучанне | Платнае навучанне | |
|---|---|---|---|---|
| | | | па выніках экзаменаў | па выніках тэсціравання |
| ФМА | Міжнародныя адносіны | 25 | 20 | 5 |
| | Міжнароднае права | 20 | 20 | 5 |
| | Сусветная эканоміка і міжнародныя эканамічныя адносіны | 20 | 20 | 5 |
| | Менеджмент | 20 | 15 | 5 |
| | Мытная справа | 20 | 20 | 5 |
| Юрфак | Правазнаўства | 150 | 50 | 25 |
| | Паліталогія | 20 | 10 | 5 |
| СФКСТ | Правазнаўства | — | 100 | — |
| | Сацыяльная работа | — | 60 | — |
| | Менеджмент | — | 100 | — |
| УСЯГО | | 1755 | 858 | 256 |

*Дадатак 2*
*да загада № 48-АД ад 03.03.1999 г.*

## ПЛАН ПРЫЁМУ НА І КУРС БЕЛДЗЯРЖУНІВЕРСІТЭТА Ў 1999 ГОДЗЕ (ЗАВОЧНАЯ ФОРМА НАВУЧАННЯ)

| Факультэт | Назва спецыяльнасці (спецыялізацыі) | Бюджэтнае навучанне | Платнае навучанне | |
|---|---|---|---|---|
| | | | па выніках экзаменаў | па выніках тэсціравання |
| Мехмат | Матэматыка | 25 | 1 | 1 |
| Біяфак | Біялогія | 50 | 24 | 6 |
| Геафак | Геаграфія | 50 | 5 | 5 |
| Гістфак | Гісторыя | 50 | 25 | 10 |
| | Гісторыка-архівазнаўства | 20 | 10 | 5 |
| | Музейная справа і ахова помнікаў гісторыі і культуры | 20 | 10 | 5 |
| ФФСН | Філасофія | 15 | 5 | 2 |
| | Сацыялогія | 15 | 5 | 3 |
| ЭФ | Эканамічная тэорыя | 15 | 3 | 2 |
| Журфак | Журналістыка | 30 | 15 | 5 |
| Філфак | Беларуская мова і літаратура | 50 | 5 | 3 |
| | Руская мова і літаратура | 25 | 5 | 3 |
| Юрфак | Правазнаўства | 75 | 30 | 20 |
| СФКСТ | Правазнаўства | — | 120 | — |
| | Сацыяльная работа | — | 90 | — |
| | Менеджмент | — | 120 | — |
| УСЯГО | | 440 | 473 | 70 |









ФАКУЛЬТЭТ ЖУРНАЛІСТЫКІ

г. Мінск, вул. Маскоўская, 15
Тэл.: 222-83-40

# САМЫ ТВОРЧЫ



ДЭКАН ФАКУЛЬТЭТА ЖУРНАЛІСТЫКІ — ДАЦЭНТ **Васіль Пятровіч ВАРАБ'ЁЎ**

У шматлікіх рэдакцыях газет, радыё і тэлебачання, выдавецтвах Рэспублікі Беларусь працуюць выпускнікі факультэта журналістыкі Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Факультэт быў створаны ў 1944 годзе. За гэты час падрыхтавана каля пяці тысяч спецыялістаў, многія з іх сталі вядомымі журналістамі, пісьменнікамі, крытыкамі, палітычнымі і грамадскімі дзеячамі. Цяпер у творчай "альма-матэр" — адзінай у Беларусі вучэбна-навуковай установе па журналістыцы і масавай камунікацыі — вучыцца амаль 1000 студэнтаў.

Падрыхтоўка будучых журналістаў вядзецца як на дзённай, так і на завочнай форме навучання на базе сярэдняй адукацыі. Атрымаць журналісцкую прафесію запрашаюцца таксама асобы, якія маюць вышэйшую адукацыю і жадаюць звязаць сваё жыццё са сродкамі масавай інфармацыі.

Класічнае універсітэцкае навучанне студэнтаў сёння скіравана на падрыхтоўку высокакласных спецыялістаў па профільным прызначэнні: палітычны аглядальнік, эканамічны аглядальнік, аглядальнік па культуры, рэпарцёр, літаратурна-мастацкі крытык, рэдактар выдавецтва, рэдактар-праграміст камп'ютэрнага дызайну, рэдактар рэкламы, каментатар тэлебачання і радыё, аператар і рэжысёр тэлебачання, фотажурналіст.

У 1996 годзе на факультэце было створана аддзяленне і адкрыта новая спецыяльнасць інфармацыя і камунікацыя. Падрыхтоўка будучых прафесіяналаў вядзецца па наступных накірунках: спецыяліст па сувязях з грамадскасцю, спецыяліст па рэкламнай камунікацыі, спецыяліст па аўдыёвізуальнай камунікацыі, спецыяліст па міжнароднай камунікацыі, спецыяліст па камунікацыі ў галіне культуры.

З 1998 года пачаўся набор на спецыяльнасць міжнародная журналістыка. На факультэце ствараецца адпаведнае аддзяленне, на якім студэнты атрымаюць грунтоўныя веды, неабходныя для прафесійнай працы ў сродках масавай камунікацыі за межамі Рэспублікі Беларусь, а таксама ў міжнародных аддзелах нацыянальнага перыядычнага друку, радыё, тэлебачання і іншых сродках масавай інфармацыі і камунікацыі.

Для працы ў рэдакцыйна-выдавецкіх установах, дзяржаўных органах, выдавецтвах, літаратурных аддзелах і аб'яднаннях сёння патрабуюцца спецыялісты, якія маюць грунтоўную прафесійную падрыхтоўку гуманітарнага профілю. Менавіта таму ў 1999 годзе на факультэце журналістыкі адкрыта новая спецыяльнасць літаратурная работа, якая дазволіць у будучым забяспечыць вышэйназваныя сферы дзейнасці неабходнымі спецыялістамі з адпаведнай кваліфікацыяй "літаратурны работнік. Літаратурны рэдактар".

За 5 гадоў універсітэцкага сталення студэнты набываюць трывалыя тэарэтычныя веды, практычныя навыкі журналісцкай работы, атрымліваюць фундаментальную падрыхтоўку па беларускай, рускай і замежнай мовах, гісторыі беларускай, рускай і замежнай журналістыкі і літаратуры, літаратурна-мастацкай крытыцы, вывучаюць асновы фотарэпартажа, тэхніку афармлення газет, радыё- і тэлеперадач, набываюць навыкі практычнай стылістыкі і рэдагавання, вывучаюць асновы камп'ютэрызацыі сродкаў масавай інфармацыі. Будучыя журналісты, літаратурныя работнікі, спецыялісты па сувязях з грамадскасцю павінны добра арыентавацца ва ўсіх праявах сацыяльнага жыцця. Разам са спецыяльнымі студэнты вывучаюць шэраг агульнаадукацыйных дысцыплін: гісторыю, філасофію, паліталогію, актуальныя праблемы эканомікі, асновы права, сацыялогію, псіхалогію, гісторыю мастацтваў, этыку, эстэтыку.

Вучэбны працэс на факультэце ажыццяўляюць вопытныя выкладчыкі, сярод якіх 6 дактароў і 22 кандыдаты навук.

На факультэце функцыянуюць тэле- і радыёстудыі, камп'ютэрныя класы і клас мультымедыя, фоталабараторыя. Студэнты рэгулярна выпускаюць вучэбную газету "Журналіст", рыхтуюць тэле-, радыёперадачы.

Першымі практычнымі крокамі студэнтаў у сродках масавай інфармацыі разам з выкладчыкамі кіруюць вопытныя супрацоўнікі газет, радыё і тэлебачання. Курс "Журналісцкае майстэрства", шматлікія дысцыпліны спецыялізацый і курсы па профілі дазваляюць студэнтам бліжэй пазнаёміцца з творчай лабараторыяй найбольш таленавітых беларускіх журналістаў, вывучыць прыёмы і метады іх работы. На пачатку навучальнага года студэнтаў чакае вытворча-вучэбная практыка ў рэдакцыях часопісаў, газет, на студыях тэлебачання і радыёвяшчання, у рэкламных агенцтвах і прэсцэнтрах, прэс-службах і службах па сувязях з грамадскасцю.

Прафесія журналіста традыцыйна асацыіруецца з рамантыкай пошуку: яна самая творчая з масавых і самая масавая з творчых. Дакладна вызначае журналіста штодзённая карпатлівая праца дзеля ісціны, справядлівасці, гуманізму.

ЮРЫДЫЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ

г. Мінск, вул. Маскоўская, 17
Тэл.: 222-83-18

# ВЫСОКАКВАЛІФІКАВАНЫЯ ПРАВАЗНАЎЦЫ ДЛЯ ГРАМАДСТВА

На дзённым і завочным аддзяленнях юрыдычнага факультэта вучыцца каля 3 тысяч студэнтаў.

За час вучобы на факультэце студэнты вывучаюць тэорыю права, канстытуцыйнае, адміністрацыйнае, фінансавае, працоўнае, грамадзянскае, крымінальнае, міжнароднае права, крымінальны і грамадзянскі працэс, крыміналістыку і іншыя дысцыпліны.

Юрыдычны факультэт рыхтуе спецыялістаў па правазнаўству па шасці спецыялізацыях: дзяржаўна-прававой, гаспадарча-прававой, судова-пракурорска-следчай, параўнальным правазнаўстве, падатковым і банкаўскім праве, адвакатуры і натарыяце.

Дзяржаўна-прававая спецыялізацыя дае студэнтам глыбокую падрыхтоўку для работы ў апаратах Нацыянальнага сходу і Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, выканаўчых камітэтах, міністэрствах, ведамствах і іншых органах дзяржаўнай улады і кіравання.

*(Заканчэнне на 11-й стар.).*

*(Заканчэнне. Пачатак на 10-й стар.).*

Выпускнікі гаспадарча-прававаой спецыялізацыі накіроўваюцца ў міністэрствы, ведамствы, на прадпрыемствы, ва ўстановы і арганізацыі для работы юрысконсультамі.

На судова-пракурорска-следчай спецыялізацыі вядзецца падрыхтоўка суддзяў, пракурораў і следчых.

Спецыялізацыя параўнальнае правазнаўства дае магчымасць яе выпускнікам працаваць у апараце Міністэрства замежных спраў, дыпламатычных місіях краіны за мяжой, сумесных прадпрыемствах, іншых арганізацыях і ўстановах.

Пасля спецыялізацыі па падатковым і банкаўскім праве выпускнікі факультэта могуць выкарыстаць свае веды ў органах падатковай службы і ўстановах банкаў.

Спецыялізацыя па адвакатуры і натарыяце накіравана на падрыхтоўку спецыялістаў па прававым абслугоўванні грамадзян — адвакатаў і натарыусаў.

На факультэце дзейнічае таксама аддзяленне паліталогіі. Яго выпускнікі атрымліваюць кваліфікацыю "палітолаг-юрыст" і могуць працаваць у органах дзяржаўнай улады і кіравання, грамадскіх аб'яднаннях, палітычных партыях у якасці кансультантаў, рэферэнтаў і г. д.

Вучэбны працэс забяспечваюць 9 кафедраў: тэорыі і гісторыі дзяржавы і права, канстытуцыйнага права, крымінальнага права, грамадзянскага права, грамадзянскага працэсу і працоўнага права, экалагічнага і аграрнага права, крымінальнага працэсу і пракурорскага нагляду, крыміналістыкі, паліталогіі. На ўсіх кафедрах працуюць высокакваліфікаваныя выкладчыкі, сярод якіх 19 дактароў і 70 кандыдатаў навук.

На факультэце ёсць бібліятэка, лабараторыя заканадаўства, крыміналістычная лабараторыя, лабараторыя інфарматыкі.

Выпускнікі, якія добра праявілі сябе ў навукова-даследчай рабоце, рэкамендуюцца для паступлення ў аспірантуру.

Юрыдычны факультэт мае добрыя ўмовы для раскрыцця здольнасцей і талентаў студэнтаў. На базе музея правазнаўства факультэта працуе гісторыка-культурны цэнтр.



*ДЭКАН ЮРЫДЫЧНАГА ФАКУЛЬТЭТА – ДАЦЭНТ* ***Валерый Мікалаевіч ГАДУНОЎ***

## МЕХАНІКА-МАТЭМАТЫЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ

**г. Мінск,
пр. Ф. Скарыны, 4
Тэл.: 220-66-84**

# ШЛЯХ, ПА ЯКІМ ІДУЦЬ ЯГО ВЫПУСКНІКІ, ШЫРОКІ І ПЕРСПЕКТЫЎНЫ

Механіка-матэматычны факультэт дзейнічае з кастрычніка 1958 года пасля падзелу фізіка-матэматычнага факультэта на два факультэты — фізічны і матэматычны.

У красавіку 1970 года на базе трох кафедраў матэматычнага факультэта быў створаны факультэт прыкладной матэматыкі. Цяпер у складзе факультэта 10 кафедраў, на якіх працуюць 32 прафесары і доктары навук, 65 дацэнтаў і кандыдатаў навук. На факультэце навучаецца 885 студэнтаў на дзённай форме, 125 студэнтаў на завочнай форме, 4 магістранты, 43 аспіранты і 3 дактаранты.



*ДЭКАН МЕХАНІКА-МАТЭМАТЫЧНАГА ФАКУЛЬТЭТА – ПРАФЕСАР* ***Мікалай Іосіфавіч ЮРЧУК***

Механіка-матэматычны факультэт вядзе падрыхтоўку па дзвюх спецыяльнасцях — механіцы і матэматыцы.

Спецыяльнасць механіка (кваліфікацыя "механік. Матэматык-прыкладнік") уключае наступныя спецыялізацыі: тэорыя пругкасці, трываласці і пластычнасці, САПР механічных сістэм, механіка робатаў і маніпулятараў. Выпускнікі гэтай спецыяльнасці атрымліваюць глыбокую матэматычную падрыхтоўку, фундаментальную адукацыю ў галіне механікі і сучасны ўзровень ведаў і навыкаў у праграміраванні і выкарыстанні ЭВМ.

Падрыхтоўка па спецыяльнасці матэматыка вядзецца на навукова-педагагічным аддзяленні, навукова-вытворчым аддзяленні і наступных, маючых індывідуальныя вучэбныя планы, спецыялізацыях: матэматычная электроніка, камп'ютэрная матэматыка, матэматычныя метады ў эканоміцы. Выпускнікі навукова-педагагічнага аддзялення атрымліваюць кваліфікацыю "матэматык. Выкладчык матэматыкі і інфарматыкі" і накіроўваюцца ў вышэйшыя і сярэднія спецыяльныя ўстановы і агульнаадукацыйныя школы.

Выпускнікі навукова-вытворчага аддзялення атрымліваюць адукацыю па класічных матэматычных спецыялізацыях (алгебра, геаметрыя, матэматычны аналіз, дыферэнцыяльныя ўраўненні, дыскрэтная матэматыка, матэматычная кібернетыка і г. д.). Ім прысвойваецца кваліфікацыя "матэматык". Яны працуюць у навукова-даследчых акадэмічных і галіновых інстытутах, канструктарскіх бюро, лабараторыях і вылічальных цэнтрах, на прадпрыемствах прамысловых міністэрстваў і ведамстваў, у банках і фірмах, вышэйшых навучальных установах і інш.

Спецыялізацыя матэматычная электроніка (кваліфікацыя "матэматык. Матэматык-сістэматэхнік") адкрылася на факультэце ў 1986 годзе для падрыхтоўкі спецыялістаў, якія будуць працаваць у навукова-даследчых акадэмічных і галіновых інстытутах, канструктарскіх бюро, прадпрыемствах і арганізацыях, звязаных з распрацоўкай і вытворчасцю мікраэлектроннай, радыёэлектроннай, вылічальнай і тэлевізійнай тэхнікі і сродкаў сувязі.

Спецыялізацыі камп'ютэрная матэматыка (кваліфікацыя "матэматык. Матэматык-сістэмны аналітык") і матэматычныя метады ў эканоміцы (кваліфікацыя "матэматык. Матэматык-эканаміст") адкрыты ў 1998 годзе. Па першай спецыялізацыі рыхтуюцца матэматыкі, якія валодаюць асноўнымі матэматычнымі пакетамі і здольны выкарыстоўваць іх у аналітычных і лікавых вылічэннях і для рашэння задач па навуковым даследаванні, праектаванні, вытворчасці і суправаджэнні інфармацыйных сістэм рознай ступені складанасці. Па другой спецыялізацыі рыхтуюцца матэматыкі-спецыялісты ў галіне распрацоўкі матэматычных метадаў даследавання эканамічных працэсаў, вывучэння розных бакоў эканомікі на аснове класічных і сучасных эканоміка-матэматычных мадэляў, распрацоўкі і абслугоўвання новых мадэляў у макра- і мікраэлектроніцы, выкарыстання і ўкаранення сучасных тэарэтычных і праграмна-інфармацыйных метадаў аналізу эканамічнай дзейнасці.

Выпускнікі факультэта, якія выявілі высокія здольнасці да навукова-даследчай работы, атрымліваюць рэкамендацыі ў аспірантуру ці могуць паступаць у магістратуру.

Студэнты маюць магчымасць на платнай аснове атрымаць дадаткова эканамічную адукацыю, кваліфікацыю рэферэнта-перакладчыка (англійская ці нямецкая мовы) ці кваліфікацыю "матэматык. Выкладчык з правам выкладання на англійскай ці нямецкай мовах".

г. Мінск,
вул. Акадэмічная, 25
Тэл. 284-26-82.

# ВЫХАД НА СУСВЕТНУЮ АРЭНУ

Факультэт міжнародных адносін створаны 1 кастрычніка 1995 года з мэтай падрыхтоўкі прафесіяналаў высокага класа ў галіне міжнародных адносін, здольных годна прадстаўляць інтарэсы нашай краіны на сусветнай арэне.

Ён уключае ў сябе 5 аддзяленняў — міжнародныя адносіны, міжнароднае права, міжнародныя эканамічныя адносіны, менеджмент у галіне міжнароднага турызму, мытная справа.

Навучальны працэс ажыццяўляюць высокакваліфікаваныя выкладчыкі, сярод якіх 9 прафесараў, звыш 50 дацэнтаў і выкладчыкаў са ступенню кандыдата навук і 54 выкладчыкі без ступені. Для чытання лекцый прыцягваюцца вядучыя спецыялісты НАН РБ, работнікі міністэрства замежных спраў, знешнеэканамічных і знешнепалітычных ведамстваў, Дзяржаўнага мытнага камітэта, буйныя спецыялісты ў галіне міжнародных адносін краін СНД і далёкага замежжа. На факультэце часта арганізоўваюцца сустрэчы з пасламі замежных краін, вядомымі палітычнымі і дзяржаўнымі дзеячамі нашай краіны, дзеячамі культуры.

Пачынаючы з 2-га курса, студэнты праходзяць навучальную і вытворчую практыку ў дзяржаўных органах і ведамствах, якія займаюцца знешняй палітыкай, на прадпрыемствах і ў фірмах. Студэнты, якія навучаюцца на факультэце, атрымліваюць глыбокія веды ў галіне агульнагуманітарных і агульнанавуковых дысцыплін, гісторыі міжнародных адносін і знешняй палітыкі, міжнароднага права, міжнародных эканамічных адносін, краіназнаўства, авалодваюць дзвюма замежнымі мовамі, набываюць навыкі працы на персанальных камп'ютэрах.

Асноўная ўвага пры падрыхтоўцы спецыялістаў на аддзяленні міжнародных адносін надаецца глыбокаму вывучэнню агульнай і айчыннай гісторыі, тэорыі і гісторыі міжнародных адносін і знешняй палітыкі вядучых краін свету, дзейнасці міжнародных арганізацый, дыпламатычнай і консульскай службы, дыпламатычнага пратаколу. Пачынаючы з 4-га курса, студэнты спецыялізуюцца па знешняй палітыцы і дыпламатыі і міжнародных арганізацыях.

На аддзяленні міжнароднага права вывучаюць гісторыю і тэорыю дзяржавы і права, міжнароднае публічнае і прыватнае права, дыпламатычнае і консульскае права, міжнароднае камерцыйнае, мытнае права, параўнаўчае адміністрацыйнае, крымінальнае, гаспадарчае, працоўнае права. З 3-га курса студэнты спецыялізуюцца па міжнародным прыватным, міжнародным публічным праве, дыпламатычнай і консульскай службе.

Будучыя эканамісты-міжнароднікі атрымліваюць веды ў галіне макра- і мікраэканамічнага развіцця, добрую матэматычную падрыхтоўку, авалодваюць навыкамі канкрэтнага аналізу эканамічных працэсаў, вывучаюць гісторыю міжнароднай гаспадаркі, бухгалтарскі ўлік, фінансава-крэдытную сістэму, сусветную эканоміку, кіраванне знешнеэканамічнай дзейнасцю, міжнародныя валютныя і крэдытныя адносіны. З 3-га курса студэнты спецыялізуюцца па знешнеэканамічнай палітыцы, па кіраванні знешнеэканамічнай дзейнасцю фірмы.

На аддзяленні міжнароднага турызму студэнты атрымліваюць веды па асновах менеджменту, маркетынгу міжнароднага турызму, арганізацыі і кіраванню турысцкімі прадпрыемствамі, вывучаюць геаграфію міжнароднага турызму, прагназіраванне міжнароднага турысцкага рынку, эканоміку міжнародных турысцкіх перавозак, рэгіянальнае планаванне турызму, бухгалтарскі ўлік, фінансава-крэдытную сістэму, сусветную эканоміку, кіраванне знешнеэканамічнай дзейнасцю, міжнародныя валютныя і крэдытныя адносіны.



*ДЭКАН ФАКУЛЬТЭТА МІЖНАРОДНЫХ АДНОСІН — ПРАФЕСАР* ***Аляксандр Віктаравіч ШАРАПА***

На аддзяленні мытнай справы, якое адкрываецца ў бягучым годзе, студэнты будуць вывучаць міжнароднае публічнае і прыватнае права, камерцыйнае, мытнае, адміністрацыйнае, крымінальнае, гаспадарчае права, бухгалтарскі ўлік, фінансава-крэдытную сістэму, сусветную эканоміку, міжнародныя валютныя і крэдытныя адносіны, валютнае рэгуляванне і валютны кантроль, таварную наменклатуру знешнеэканамічнай дзейнасці, авалодваюць прыёмамі барацьбы з мытнымі правапарушэннямі, спецсродкамі мытнага кантролю, інфармацыйнымі мытнымі тэхналогіямі.

Вялікая ўвага на факультэце надаецца самастойнай навукова-даследчай працы студэнтаў. Яны выступаюць на навуковых канферэнцыях, прадстаўляюць свае распрацоўкі на універсітэцкіх, рэспубліканскіх і міжнародных конкурсах.

Маладыя спецыялісты будуць падрыхтаваны да дыпламатычнай, навукова-даследчай, інфармацыйна-аналітычнай дзейнасці ў галіне міжнародных адносін, міжнароднага права і знешнеэканамічнай дзейнасці.

Выпускнікі факультэта змогуць працаваць у дзяржаўных органах кіравання, якія займаюцца знешнеэканамічнай і знешнепалітычнай дзейнасцю, у міжнародных арганізацыях і рэгіянальных аб'яднаннях, у якіх Рэспубліка Беларусь мае пасольскія прадстаўніцтвы, на прадпрыемствах, у знешнегандлёвых, турыстычных і камерцыйных фірмах, банках. Яны могуць займацца навукова-педагагічнай работай у навуковых і навучальных установах.

## ФАКУЛЬТЭТ КІРАВАННЯ І САЦЫЯЛЬНЫХ ТЭХНАЛОГІЙ

г. Мінск,
вул. Батанічная, 15
тэл. 235-17-22

# ПРАДПРЫМАЛЬНІКІ І МЕНЕДЖЭРЫ ВЫСОКАГА КЛАСА

Факультэт адкрыты ў сакавіку 1997 года. Навучанне на ім вядзецца на платнай аснове. Прыём дакументаў на наступны навучальны год пачынаецца з 22 чэрвеня 1999 года.

Факультэт кіравання і сацыяльных тэхналогій рыхтуе спецыялістаў па спецыяльнасцях правазнаўства (спецыялізацыя — прававое забеспячэнне бізнесу), сацыяльная работа (спецыялізацыя — арганізацыя сацыяльна-псіхалагічнай дапамогі насельніцтву), менеджмент (спецыялізацыя — кіраванне персаналам прадпрыемстваў і працоўнымі рэсурсамі).

Набыць адукацыю на нашым факультэце можна на дзённай і завочнай формах навучання. Уступныя выпрабаванні праводзяцца ў выглядзе вусных экзаменаў, субяседавання і пісьмовага тэсціравання.

Асноўная мэта факультэта — падрыхтоўка прадпрымальнікаў і менеджэраў высокага класа, здольных прымаць эфектыўныя рашэнні ва ўмовах рыначнай эканомікі.

Канцэпцыя навучання распрацавана на аснове вопыту расійскіх і заходніх навучальных устаноў. За час навучання студэнты атрымліваюць усебаковую гуманітарную падрыхтоўку, вывучаюць тэорыю і практыку прадпрымальніцкай дзейнасці, яе арганізацыйна-эканамічныя, прававыя, фінансавыя і кіраўнічыя аспекты.

Вучэбная праграма прадугледжвае абавязковае паглыбленае вывучэнне замежнай мовы.

Шэраг вучэбных курсаў плануецца весці сіламі замежных спецыялістаў. Побач з традыцыйнымі метадамі навучання вялікая ўвага надаецца індывідуальнай рабоце. Прадугледжваецца паглыбленае вывучэнне камп'ютэрных тэхналогій. У летні перыяд факультэт прадастаўляе магчымасць зарабіць грошы на навучанне ў Нарвегіі, Англіі, Фінляндыі, ЗША і іншых краінах на сельгасработах.

У час навучання прадугледжваецца паступовае ўключэнне кожнага студэнта ў практычную дзейнасць у юрыдычных і камерцыйных фірмах.

*ДЭКАН ФАКУЛЬТЭТА КІРАВАННЯ І САЦЫЯЛЬНЫХ ТЭХНАЛОГІЙ – **Зінаіда Іванаўна ВАЛОВІЧ-ГРЫГОР'ЕВА***

## ГЕАГРАФІЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ

г. Мінск,
вул. Ленінградская, 12
Тэл.: 226-55-53

# УСЁ ПРА ЗЯМЛЮ

Геаграфічны факультэт - буйнейшы ў краіне вучэбна-навуковы цэнтр па падрыхтоўцы географаў, геолагаў і эколагаў, які заснаваны ў 1934 годзе. Ён дае глыбокую прафесійную адукацыю ў галіне навук аб Зямлі, дазваляе атрымаць грунтоўныя веды ў рамках спецыялізацый па геамарфалогіі, гідралогіі сушы, рацыянальным прыродакарыстанні і ахове прыроды, картаграфіі, метэаралогіі і кліматалогіі, геаграфіі глебаў і зямельных рэсурсаў, літалогіі, геалогіі і разведцы карысных выкапняў, геаграфічных інфармацыйных сістэмах, эканамічнай геаграфіі, дэмаграфіі, рэгіянальнай сацыяльна-эканамічнай геаграфіі, геаграфіі турызму і методыцы арганізацыі экскурсійнай справы.

З 1994 года на факультэце вядзецца падрыхтоўка спецыялістаў па новых спецыяльнасцях экалогія і геалогія і разведка карысных выкапняў. Геалогія — адзіная ва універсітэце тэхнічная спецыяльнасць. З 1999 года пачынаецца набор на спецыялізацыю геаграфічныя інфармацыйныя сістэмы, дзе навучанне будзе весціся па асобным плане з размеркаваннем спецыялістаў для сістэмы Дзяржкамітэта па зямельных рэсурсах, геадэзіі і картаграфіі.

У складзе факультэта працуе восем кафедраў: агульнага землязнаўства, геадэзіі і картаграфіі, глебазнаўства і геалогіі, дынамічнай геалогіі, фізічнай геаграфіі і аховы прыроды, фізічнай геаграфіі мацерыкоў і акіянаў і методыкі выкладання геаграфіі, эканамічнай геаграфіі Беларусі і дзяржаў Садружнасці, эканамічнай геаграфіі замежных краін. Дзейнічаюць чатыры навукова-даследчыя лабараторыі: экалогіі ландшафтаў, возеразнаўства, маніторынгу водных рэсурсаў, геаэкалагічных праблем. Навуковым, вучэбным і метадычным мэтам служыць музей землязнаўства, геастанцыя "Заходняя Бярэзіна", Браслаўскі азёрны стацыянар.

На факультэце на пастаяннай аснове працуюць 13 дактароў навук (прафесараў) і 46 кандыдатаў навук. Сярод выпускнікоў факультэта пяць акадэмікаў і членаў-карэспандэнтаў НАН РБ, звыш 35 дактароў навук, прафесараў, 16 лаўрэатаў Дзяржаўных прэмій.



*ДЭКАН ГЕАГРАФІЧНАГА ФАКУЛЬТЭТА — ПРАФЕСАР **Іван Іванавіч ПІРОЖНІК***

Студэнты факультэта атрымліваюць грунтоўную спецыяльную падрыхтоўку, вывучаюць значную колькасць гуманітарных дысцыплін. Вялікая роля надаецца вучэбнай і вытворчай практыцы. Ужо на першым і другім курсах студэнты практычна засвойваюць тапаграфію, геалогію, гідралогію, геамарфалогію, глебазнаўства, метэаралогію, біягеаграфію, ландшафтазнаўства і інш. Комплексная геаграфічная практыка праводзіцца па спецыяльных маршрутах у межах краіны. Старшакурснікі праходзяць вытворчую практыку ў навукова-даследчых інстытутах Нацыянальнай акадэміі навук, лабараторыях геаграфічнага факультэта, іншых арганізацыях. Значная частка студэнтаў уключаецца ў склад экспедыцый, дзе яны засвойваюць методыку палявых даследаванняў. Шырокія магчымасці маюць студэнцкія навукова-даследчыя лабараторыі (іх чатыры), дзе студэнты могуць займацца грунтоўнымі навуковымі даследаваннямі, якія з цягам часу становяцца курсавымі і дыпломнымі работамі, артыкуламі, справаздачамі. Для паслуг выкладчыкаў і студэнтаў на факультэце створаны чытальная зала геаграфічных навук, камп'ютэрны клас, спецыялізаваныя вучэбныя кабінеты. Шэраг студэнтаў праходзяць навучанне або стажыроўку ў ВНУ краін далёкага замежжа.

Студэнты геафака не замыкаюцца толькі на вучобе, яны актыўна ўдзельнічаюць у спартыўных спаборніцтвах, вечарах і дыскатэках, што праводзяцца на факультэце. Шырокую вядомасць набылі ўдзельнікі каманды Клуба вясёлых і знаходлівых.

Пасля заканчэння вучобы ў БДУ географы, экалагі і геолагі знаходзяць свае працоўныя месцы ў агульнаадукацыйных школах, сярэдніх і вышэйшых навучальных установах, інстытутах Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, на картаграфічных прадпрыемствах, у гідраметэаслужбе, у праектных, вышуковых, турысцка-экскурсійных, прыродаахоўных, геалагічных і землеўпарадкавальных арганізацыях. Лепшыя з лепшых працягваюць навучанне ў магістратуры і аспірантуры.

# ФІЗІЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ

г. Мінск,
вул. Бабруйская, 5
Тэл.: 220-62-51

# ДОБРАЯ ПРАФЕСІЙНАЯ ПАДРЫХТОЎКА — І НІЯКІХ ПРАБЛЕМ З ПРАЦАЎЛАДКАВАННЕМ



*ДЭКАН ФІЗІЧНАГА ФАКУЛЬТЭТА — ПРАФЕСАР **Віктар Міхайлавіч АНІШЧЫК***

Фізічны факультэт з'яўляецца буйнейшым у рэспубліцы навучальным і навуковым цэнтрам, які рыхтуе высокакваліфікаваных спецыялістаў па важнейшых напрамках сучаснай фізікі, фізічнага матэрыялазнаўства для навукова-даследчых устаноў, прамысловых прадпрыемстваў і народнай адукацыі.

Навучанне на факультэце вядзецца па дзённай форме. Выпускнікі факультэта атрымліваюць кваліфікацыю "фізік", ці "інжынер-фізік", ці "фізік. Выкладчык фізікі і інфарматыкі". Існуе магчымасць атрымаць акадэмічную ступень магістра фізікі. Акрамя гэтага, існуе магчымасць атрымаць у тэрмін навучання паралельна кваліфікацыю "выкладчык фізікі і інфарматыкі". Плануецца падрыхтоўка спецыялістаў з кваліфікацыяй "фізік. Менеджэр", а таксама адкрыццё на факультэце навучання без адрыву ад вытворчасці з магчымасцю атрымання кваліфікацыі пасля выканання навучальнага плана незалежна ад тэрміну навучання, але не даўжэй чым за восем гадоў.

Пасля заканчэння першага курса студэнты па іх жаданні размяркоўваюцца на педагагічны і навукова-інжынерны напрамкі, а пасля другога — па спецыялізацыях.

Падрыхтоўка спецыялістаў-фізікаў на факультэце ажыццяўляецца па розных галінах фізічнай навукі: па фізіцы паўправаднікоў і паўправадніковых матэрыялаў, мікраэлектроніцы і сучаснай мікраэлектроннай тэхналогіі, квантавай і оптаэлектроніцы, класічнай і нелінейнай оптыцы, лазерных сістэмах і тэхналогіях, фізічнай оптыцы, фізіцы ахоўных і плазменных пакрыццяў і плёнак, фізіцы цвёрдага цела і матэрыялазнаўстве, ядзернай фізіцы і фізіцы ядзерных рэактараў, электронным прыборабудаванні і схематэхніцы, біяфізіцы і біятэхналогіі, цеплафізіцы, энергафізіцы і нетрадыцыйных крыніцах энергіі, атамнай фізіцы і фізічных метадах пераўтварэння інфармацыі, фізіцы плазмы і плазменнай апрацоўкі матэрыялаў, фізічнай метралогіі і метадах дыягностыкі, функцыянальных малекулярных і інтэлектуальных матэрыялах, методыцы выкладання фізікі, мадэліраванні фізічных працэсаў, тэарэтычнай фізіцы і праблемах сучаснай фізікі, праграміраванні і інфармацыйным забеспячэнні вылічальных сістэм, вучэбным фізічным эксперыменце.

Акрамя фундаментальнай падрыхтоўкі па фізіцы, студэнты факультэта атрымліваюць неабходныя веды па педагогіцы і псіхалогіі, вывучаюць методыку выкладання фізікі і інфарматыкі, эканоміку і асновы арганізацыі вытворчасці, маюць магчымасць атрымаць дадатковую падрыхтоўку па замежнай мове (пасведчанне "перакладчык-рэферэнт навукова-тэхнічнай літаратуры"). Асаблівая ўвага на факультэце звяртаецца на сучасныя камп'ютэрныя тэхналогіі і інфарматыку.

Шмат увагі на факультэце надаецца развіццю здольнасцей будучых спецыялістаў. Студэнты факультэта актыўна займаюцца навукова-даследчай работай. На факультэце функцыянуе больш за дзесяць гурткоў па розных фізічных напрамках, студэнцкія навукова-даследчыцкія лабараторыі. Каля двух дзесяткаў студэнтаў-фізікаў кожны год атрымліваюць гранты розных фондаў і грамадскіх аб'яднанняў.

Студэнты факультэта маюць магчымасць працягваць навучанне ў ВНУ ЗША, ФРГ і іншых краін.

Выпускнікі факультэта могуць працаваць у навукова-даследчых інстытутах, канструктарскіх бюро, у ВНУ, тэхнікумах, ПТВ і школах краіны, на заводах, фабрыках і іншых установах і прадпрыемствах.

Лепшыя студэнты пасля заканчэння навучання могуць працаваць ці працягваць навучанне ў аспірантуры не толькі Белдзяржуніверсітэта і Акадэміі навук Беларусі, але і ў іншых краінах блізкага і далёкага замежжа.

Узровень адукацыі, атрыманы на факультэце, дазваляе выпускнікам лёгка адаптавацца не толькі да працы па фізіка-тэхнічным профілі, але і ў іншых галінах (арганізацыйнай, камерцыйнай, банкаўскай, выдавецкай і іншых сферах).

# ГІСТАРЫЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ

г. Мінск,
вул.Чырвонаармейская, 6
Тэл.: 227-30-14

# ЯК ТРАПІЦЬ У ГІСТОРЫЮ

Гістарычны факультэт БДУ з'яўляецца буйнейшым у нашай краіне цэнтрам падрыхтоўкі спецыялістаў-гісторыкаў. Год яго афіцыйнага адкрыцця — 1934. За час свайго існавання факультэт падрыхтаваў больш за 8 тысяч спецыялістаў. Зараз на дзённай і завочнай формах навучання займаецца каля 1300 студэнтаў.

Выкладчыцкі калектыў факультэта — гэта прызнаныя спецыялісты ва ўсіх галінах гістарычных ведаў. У сучасны момант на факультэце працуе 80 штатных супрацоўнікаў, сярод якіх 14 прафесараў і 45 дацэнтаў. Супрацоўнікі факультэта вядуць плённую даследчыцкую працу па пытаннях гісторыі Беларусі, Расіі, Украіны, краін Заходняй Еўропы, Афрыкі і Азіі, крыніцазнаўства, этналогіі, культурнай антрапалогіі, археалогіі, нумізматыкі, палеаграфіі, археаграфіі, рэлігіязнаўства, метадалогіі і методыкі гістарычнага даследавання. Значныя вынікі дасягнуты ў падрыхтоўцы падручнікаў для ВНУ і школ, метадычных распрацовак па ўсіх гістарычных дысцыплінах, вучэбных праграм.

Падрыхтоўка студэнтаў ажыццяўляецца на двух аддзяленнях па трох спецыяльнасцях і 9 спецыялізацыях. Старэйшае і буйнейшае з іх — аддзяленне гісторыі, выпускнікі якога атрымліваюць кваліфікацыю "гісторык. Выкладчык гісторыі".

*(Заканчэнне на 15-й стар.).*



*ДЭКАН ГІСТАРЫЧНАГА ФАКУЛЬТЭТА – ДАЦЭНТ*
***Алег Антонавіч ЯНОЎСКІ***

*(Заканчэнне. Пачатак на 14-й стар.).*

Падрыхтоўка гісторыкаў ідзе па дзвюх плынях: беларускамоўнай і рускамоўнай. У 1992 годзе на факультэце распачата падрыхтоўка спецыялістаў на аддзяленні архівазнаўства і музеязнаўства па спецыяльнасцях гісторыка-архівазнаўства (кваліфікацыя "гісторык-архівіст") і музейная справа і ахова помнікаў гісторыі і культуры (кваліфікацыя "музеязнаўца, арганізатар музейнай справы"). На ўсіх аддзяленнях навучанне вядзецца па дзённай і завочнай формах. Распачата падрыхтоўка да адкрыцця спецыяльнасцей археалогія і этналогія (адпаведныя спецыялізацыі на факультэце існуюць даўно).

На гістарычным факультэце працуе 8 кафедраў: гісторыі Беларусі старажытнага часу і сярэдніх вякоў, гісторыі Беларусі новага і навейшага часу, гісторыі старажытнага свету і сярэднявечча, гісторыі новага і навейшага часу, гісторыі Расіі, гісторыі паўднёвых і заходніх славян, археалогіі, этнаграфіі і дапаможных гістарычных дысцыплін, крыніцазнаўства і музеязнаўства. Студэнты маюць магчымасць, пачынаючы з трэцяга курса, спецыялізавацца па адной з названых кафедраў, удзельнічаць у даследчыцкіх работах па абраным навуковым накірунку.

Студэнты-гісторыкі атрымліваюць глыбокія спецыяльныя веды, неабходныя для будучай прафесіі. У першую чаргу — па гісторыі Беларусі, гісторыі славянскіх краін, гісторыі краін Заходняй Еўропы, Амерыкі, Азіі і Афрыкі, па археалогіі, этнаграфіі, краязнаўстве, гістарычнай інфарматыцы, крыніцазнаўстве. Акрамя гэтага, вывучаюцца такія дысцыпліны, як філасофія, логіка, псіхалогія, педагогіка, беларуская мова і літаратура, лацінская і польская мовы, адна з сусветных замежных моў і іншыя.

Студэнтам прапануецца шэраг сучасных курсаў і спецкурсаў (псіхагісторыя, гісторыя лацінаамерыканскай цывілізацыі, антрапалогія і інш.), якія на сённяшні дзень не чытаюцца ў іншых ВНУ краіны.

Значнае месца ў навучальным працэсе на факультэце займае самастойная навукова-даследчая праца студэнтаў. Яе формамі з'яўляюцца напісанне курсавых і дыпломных работ, удзел у конкурсах навуковых работ і праектаў. Многія студэнты факультэта маюць навуковыя публікацыі, з'яўляюцца лаўрэатамі конкурсаў, уладальнікамі грамат для навучання за мяжой.

Факультэт мае пагадненні аб творчым супрацоўніцтве з Йенскім (ФРГ), Уроцлаўскім (Польшча), Маскоўскім, Расійскім гуманітарным універсітэтамі. На факультэце існуюць магістратура, аспірантура, дактарантура. Іх выпускнікі характарызуюцца як спецыялісты з шырокім кругаглядам, высокім агульнаадукацыйным і навуковым узроўнем.

## БІЯЛАГІЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ

**г. Мінск, вул. Курчатава, 5**
**Тэл.: 277-10-06**

# У НАСТУПНЫМ СТАГОДДЗІ БІЁЛАГІ І ЭКОЛАГІ АБАВЯЗКОВА ЗНОЙДУЦЬ ПРЫМЯНЕННЕ СВАІМ СІЛАМ

Біялагічны факультэт з'яўляецца буйнейшым цэнтрам па падрыхтоўцы высокакваліфікаваных спецыялістаў у Рэспубліцы Беларусь па спецыяльнасцях біялогія і экалогія. Студэнты атрымліваюць адну з трох кваліфікацый: "біёлаг. Выкладчык біялогіі і хіміі", або "біёлаг-біятэхнолаг. Выкладчык біялогіі", або "эколаг-біёлаг. Выкладчык экалогіі і біялогіі".

На першым і другім курсах студэнты ўсіх кваліфікацый навучаюцца па агульным вучэбным плане, які прадугледжвае вывучэнне асноўных агульнаадукацыйных, сацыяльна-грамадскіх і базавых біялагічных дысцыплін. Пачынаючы з трэцяга курса, навучанне студэнтаў ажыццяўляецца асобна, згодна з адпаведнай кваліфікацыяй.

За перыяд навучання студэнты атрымліваюць шырокую прафесійную падрыхтоўку, якая забяспечваецца вывучэннем у вялікім аб'ёме такіх дысцыплін біялагічнага цыкла, як батаніка, заалогія, цыталогія і гісталогія, біяхімія, біяфізіка, радыебіялогія, фізіялогія раслін, мікрабіялогія, вірусалогія, імуналогія, біятэхналогія, генетыка, тэорыя эвалюцыі, экалогія, ксенабіялогія і г. д.

Падрыхтоўка спецыялістаў з кваліфікацыямі "эколаг-біёлаг" і "біёлаг-біятэхнолаг" прадугледжвае, акрамя таго, вывучэнне шэрага дадатковых сучасных спецыяльных дысцыплін, такіх, як прыкладная экалогія, хімічная экалогія, сацыяльная экалогія, радыеэкалогія, эканоміка прыродакарыстання, глабальная экалогія, экалогія чалавека, экалагічнае права, фізіялагічная экалогія, экалагічны маніторынг, кантроль і экспертыза, біяпашкоджанні, папуляцыйная экалогія і г. д. ("эколаг-біёлаг"); малекулярная біялогія клеткі, малекулярная генетыка, клетачная інжынерыя, генетычная інжынерыя, імунаферментны аналіз, імабілізаваныя клеткі і ферменты, біятэхналогія ачысткі прамысловых адходаў, інжынерная энзімалогія, фармакагнозія, селекцыя прадуцэнтаў, культываванне клетак, біясэнсарныя сістэмы, вектарныя сістэмы, біятрансфармацыя рэчываў, генатэрапія і г. д. ("біёлаг-біятэхнолаг").

Факультэт рыхтуе кадры біёлагаў па спецыялізацыях: батаніка, заалогія, мікрабіялогія, генетыка, фізіялогія чалавека і жывёл, фізіялогія раслін, агульная экалогія, біяхімія, біятэхналогія.

Пры падрыхтоўцы спецыялістаў прадугледжана праходжанне практык: на першым і другім курсах — палявая практыка па батаніцы і заалогіі, на трэцім — вучэбная практыка па спецыялізацыі на кафедрах, у біяцэнозах, НДІ, вытворчых установах, на чацвёртым і пятым курсах — вытворчая і педагагічная практыка.

Вучэбны працэс і навуковую работу факультэта забяспечваюць 8 кафедраў, НДЛ гідраэкалогіі, НДЛ кафедраў, заамузей, гербарый, батанічны сад, вучэбна-даследчая гаспадарка "Шчамысліца", вучэбная лабараторыя методыкі выкладання біялогіі.

Пасля заканчэння факультэта выпускнікі могуць працаваць выкладчыкамі сярэдніх і вышэйшых навучальных устаноў, супрацоўнікамі навукова-даследчых інстытутаў, а таксама на прадпрыемствах аграпрамысловага комплекса, фармацэўтычнай, мікрабіялагічнай і харчовай прамысловасці, у запаведніках, батанічных садах, на селекцыйных станцыях і г. д.



*ДЭКАН БІЯЛАГІЧНАГА ФАКУЛЬТЭТА — ДАЦЭНТ*
***Уладзімір Васільевіч ЛЫСАК***

Выпускнікі, якія паказалі схільнасць да навукова-даследчай работы, высокую эрудыцыю па біялогіі, атрымліваюць рэкамендацыю савета факультэта для паступлення ў аспірантуру і магістратуру.

## ФАКУЛЬТЭТ ФІЛАСОФІІ І САЦЫЯЛЬНЫХ НАВУК

г.Мінск,
вул. К. Маркса, 31
Тэл.: 227-60-25

# ГРАМАДСТВУ НЕ ПРАЖЫЦЬ БЕЗ РАЗУМОВАЙ ЭЛІТЫ

Факультэт пачаў сваю дзейнасць з 1 верасня 1989 г. як філасофска-эканамічны факультэт. 1 сакавіка 1999 г. з нагоды адкрыцця ў Белдзяржуніверсітэце эканамічнага факультэта быў перайменаваны ў факультэт філасофіі і сацыяльных навук. Ён уключае ў сябе чатыры аддзяленні — філасофіі, сацыялогіі, псіхалогіі, інфармацыі і камунікацыі. На сённяшні дзень на факультэце навучаецца каля 800 студэнтаў і магістрантаў. Вядзецца падрыхтоўка высокакваліфікаваных навуковых і педагагічных кадраў праз інстытут дактарантуры (6 чалавек) і аспірантуры (4 чалавекі).

Спецыяльная падрыхтоўка на факультэце ажыццяўляецца кафедрамі філасофіі і метадалогіі навукі, гісторыі філасофіі і культуры, этыкі і рэлігіязнаўства, сацыялогіі, псіхалогіі.

Пачынаючы з 3 курса, студэнты праходзяць вытворчую педагагічную практыку на факультэтах універсітэта, у іншых ВНУ і навуковых установах Мінска, у органах дзяржаўнага кіравання. Вучэбны працэс ажыццяўляецца кваліфікаванымі выкладчыкамі, сярод якіх 15 дактароў і 48 кандыдатаў навук, дацэнтаў. Для выкладання запрашаюцца спецыялісты з інстытутаў Акадэміі навук Беларусі, а таксама з іншых навуковых цэнтраў рэспублікі, блізкага і далёкага замежжа. Студэнты факультэта прыцягваюцца да актыўнай творчай дзейнасці, спрабуючы свае сілы ў навукова-даследчай рабоце, удзельнічаючы ў навуковых канферэнцыях, якія праводзяцца як ва універсітэце, так і ў іншых ВНУ.

З гэтага года на аддзяленні філасофіі пачынаецца падрыхтоўка спецыялістаў па трох спецыялізацыях: філасофская антрапалогія і эпістэмалогія, гісторыя філасофіі і культуры, філасофія рэлігіі і маралі. Студэнты гэтага аддзялення атрымліваюць грунтоўную агульнаадукацыйную падрыхтоўку ў галіне прыродазнаўчых і сацыяльна-гуманітарных навук, а таксама авалодваюць значнымі ведамі па гісторыі філасофіі і культуры, логікі, псіхалогіі, шырокім коле накірункаў сучаснай філасофіі. У апошнія гады на факультэце асобая ўвага надаецца развіццю выкладання і навуковых даследаванняў у галінах філасофіі культуры і рэлігіязнаўства, якія выклікаюць асаблівую цікавасць сярод абітурыентаў і студэнтаў. Пры вывучэнні спецкурсаў і спецсемінараў студэнты атрымліваюць трывалыя веды па рэлігіязнаўчых праблемах, звязаных з мараллю, філасофіяй, культурай, палітыкай.

На аддзяленні сацыялогіі студэнты авалодваюць цэлым комплексам сацыялагічных дысцыплін агульнага і спецыяльнага характару, вывучаюць тэорыю і гісторыю сацыялагічнай спадчыны, асвойваюць навыкі машыннай апрацоўкі зыходных дадзеных. Вялікая ўвага надаецца вывучэнню дысцыплін матэматычнага цыкла, агульнай і сацыяльнай псіхалогіі. Спецкурсы прысвечаны вывучэнню праблем працы, побыту, зносін, кіравання, выхавання, культуры, адукацыі і г.д.



*ДЭКАН ФАКУЛЬТЭТА ФІЛАСОФІІ І САЦЫЯЛЬНЫХ НАВУК— ПРАФЕСАР* ***Анатоль Ізотавіч ЗЕЛЯНКОЎ***



*На «Дні ведаў—98»*

У 1993 годзе ва універсітэце адкрыта аддзяленне псіхалогіі. Вучэбная праграма аддзялення прадугледжвае падрыхтоўку спецыялістаў у галіне агульнай, сацыяльнай і медыцынскай псіхалогіі. Акрамя цэлага комплексу сацыяльных дысцыплін, студэнты вывучаюць шэраг прадметаў агульнакультурнага, матэматычнага і прыродазнаўчага профілю.

Студэнты аддзялення інфармацыі і камунікацыі вывучаюць адну з самых перспектыўных і папулярных сфер сацыяльных навук — тэорыю і практыку міжасабовай, арганізацыйнай, палітычнай, міжнароднай і іншых відаў камунікацыі, асвойваюць вялікі цыкл дысцыплін па новых інфармацыйных тэхналогіях на сучаснай тэхнічнай базе. Выпускнікі гэтага аддзялення маюць магчымасць знайсці дастасаванне атрыманым ведам і навыкам у прэс-службах і службах па сувязях з грамадскасцю, менеджменце, рэкламе, а таксама ў многіх іншых накірунках дзейнасці дзяржаўных і недзяржаўных структур.

г. Мінск,
вул. Курчатава, 5
Тэл.: 277-19-01

# НАВУКОЎЦЫ, КАНСТРУКТАРЫ, ВЫТВОРЦЫ І КАМЕРСАНТЫ

Больш за 20 гадоў факультэт радыёфізікі і электронікі рыхтуе высокакваліфікаваных спецыялістаў у галіне радыёфізікі, электронікі, інфармацыйных тэхналогій.

Падрыхтоўка спецыялістаў вядзецца для навукова-даследчай, доследна-канструктарскай, вытворчай, арганізацыйна-кіраўнічай, а з 1995 года — і камерцыйнай дзейнасці.

Сярод выпускнікоў факультэта ёсць навукоўцы з сусветным імем, чый уклад у сучасную навуку адзначаны высокімі ўзнагародамі і званнямі, кіраўнікі буйных прадпрыемстваў і фірмаў, камерцыйных банкаў.

Сёння факультэт радыёфізікі і электронікі — гэта буйны навучальны і навуковы цэнтр, у якім атрымліваюць вышэйшую адукацыю больш за 750 студэнтаў, магістрантаў і аспірантаў. На 8 кафедрах факультэта працуе больш за 90 выкладчыкаў, сярод якіх адзін акадэмік і 2 члены-карэспандэнты НАН Беларусі, 14 дактароў навук і прафесараў. Пры кафедрах працуюць навукова-даследчыя лабараторыі і групы, студэнцкія навукова-даследчыя лабараторыі. У навуковай і педагагічнай дзейнасці факультэт шчыльна супрацоўнічае з НДІ прыкладных фізічных праблем імя А.Н. Сеўчанкі, у значнай ступені выкарыстоўвае яго унікальнае абсталяванне.

Факультэт вядзе падрыхтоўку па трох сучасных спецыяльнасцях: радыёфізіка (кваліфікацыя "радыёфізік"), фізічная электроніка (кваліфікацыя "інжынер-фізік"), камерцыйная дзейнасць на рынку радыёэлектронных сродкаў і інфармацыйных паслуг (кваліфікацыя "эканаміст-менеджэр").

У аснове канцэпцыі навучання на факультэце ляжаць наступныя прынцыпы: фундаментальнасць адукацыі, спецыялізацыя ў сучасных галінах радыёфізікі і электронікі, улік зменаў сацыяльна-эканамічнай сітуацыі ў свеце і краіне, улік сусветнага вопыту пабудовы сістэмы вышэйшай адукацыі.



*ДЭКАН ФАКУЛЬТЭТА РАДЫЁФІЗІКІ І ЭЛЕКТРОНІКІ – ПРАФЕСАР* ***Сцяпан Рыгоравіч МУЛЯРЧЫК***

Вучэбныя планы спецыяльнасцей радыёфізіка і фізічная электроніка ўключаюць блокі дысцыплін па вышэйшай матэматыцы, агульнай і тэарэтычнай фізіцы, радыёфізіцы, электроніцы і інфарматыцы. Радыёфізіка, электроніка і інфарматыка — галіны ведаў, якія вызначаюць партрэт сённяшняга выпускніка факультэта. Непасрэдна ў гэтых галінах навукі і тэхнікі працуюць нашыя выпускнікі.

Кожнаму студэнту пасля другога курса даецца магчымасць спецыялізацыі ў адным з наступных кірункаў: па спецыяльнасці радыёфізіка — статыстычная радыёфізіка, радыёоптыка, квантавая радыёфізіка і лазерныя сістэмы, лазерныя аптычныя тэхналогіі, аптычная апрацоўка інфармацыі, акустыка, стахастычныя працэсы і сістэмы, інтэлектуальныя сістэмы, вылічальная радыёфізіка, іконіка, фізічная кібернетыка, радыёфізіка навакольнага асяроддзя, медыцынская радыёэлектроніка, прыкладная электрадынаміка, фізічная метралогія; па спецыяльнасці фізічная электроніка — цвердацельная электроніка, плазменная электроніка, наназлектроніка, квантавая электроніка, функцыянальная электроніка, фізічная мікраэлектроніка, лічбавая электроніка, вылічальная электроніка, кібернетычныя сістэмы электронікі, інфармацыйна-аналітычныя метады ў электроніцы.



*Заняткі на факультэце радыёфізікі і электронікі*

Студэнты, якія навучаюцца на спецыяльнасці камерцыйная дзейнасць, вывучаюць тры вельмі важныя для сённяшняга дня галіны ведаў — эканоміку, інфарматыку, радыёэлектроніку. Выпускнікі-"радыёкамерсанты" — гэта эканамісты, якія дасканала валодаюць камп'ютэрнымі тэхналогіямі для вырашэння задач практычнай эканомікі, яны лёгка арыентуюцца на рынку складанай радыёэлектроннай (офіснай, побытавай, прамысловай) тэхнікі і ў сферы інфармацыйных паслуг.

Неабходна падкрэсліць, што для студэнтаў спецыяльнасцей радыёфізіка і фізічная электроніка ёсць магчымасць разам з асноўнай спецыяльнасцю паралельна прайсці навучанне па спецыяльнасці камерцыйная дзейнасць і атрымаць кваліфікацыю эканаміста-менеджэра.

На факультэце пануе свабодная сяброўская атмасфера. Асаблівая ўвага надаецца навуковай працы студэнтаў. Галоўная рыса выпускніка факультэта — высокая культура мыслення, уменне аналізаваць і прагназіраваць вынікі. Радыёфізік сёння — гэта спецыяліст з шырокім кругаглядам і эрудыцыяй, які свабодна арыентуецца ў сучасных тэндэнцыях развіцця як навукі і тэхнікі, так і ўсёй сацыяльна-эканамічнай сістэмы, можа самастойна знаходзіць рашэнні для складаных задач з самых разнастайных галінаў чалавечай дзейнасці.

Чакаем вас на факультэце радыёфізікі і электронікі!

## ФІЛАЛАГІЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ

г. Мінск,
вул. К. Маркса, 31
Тэл.: 222-34-21

# НЕ СУМНЯВАЙЦЕСЯ Ў СВАІХ ФІЛАЛАГІЧНЫХ ЗДОЛЬНАСЦЯХ



*ДЭКАН ФІЛАЛАГІЧНАГА ФАКУЛЬТЭТА ПРАФЕСАР **Ларыса Аляксандраўна МУРЫНА***

Усіх прыхільнікаў роднага слова, усіх, каго вабіць прыгожае пісьменства, Беларускі дзяржаўны універсітэт запрашае паспаборнічаць на ўступных конкурсных экзаменах, пераможцаў якіх чакае права стаць студэнтам філалагічнага факультэта. Тут на працягу першых чатырох-пяці гадоў навучання ў выніку паспяховых пераадольванняў запланаваных залікаў і іспытаў вы атрымаеце вышэйшую адукацыю, праслухаеце спецыяльныя дадатковыя курсы гуманітарнай і фундаментальнай навуковай падрыхтоўкі.

Не сумнявайцеся ў сваіх філалагічных здольнасцях, бо калі вашу прагу да ведаў не спатоліць жаданы атэстат аб вышэйшай адукацыі, вы маеце магчымасць на працягу яшчэ аднаго года ўдасканальвацца ў сваіх прафесійных памкненнях па індывідуальных вучэбных планах і дамагчыся акадэмічнай ступені магістра. Калі гэта станецца недастатковым — перад вамі шлях у вялікую навуку праз аспірантуру на ільготных умовах.

На сённяшні момант на факультэце працуюць 17 прафесараў і 82 дацэнты, якія рыхтуюць высокакваліфікаваных спецыялістаў па наступных накірунках: беларуская мова і літаратура, руская мова і літаратура, польская мова і літаратура, балгарская, чэшская, сербская і харвацкая мовы і літаратуры, англійская мова і літаратура, нямецкая мова і літаратура, французская мова і літаратура, італьянская мова і літаратура, класічныя мовы і антычная літаратура. Паралельна з пералічанымі прафесіямі вы можаце задавальняць свае патрэбы па самых разнастайных тэмах замежнай літаратуры, а таксама ў галінах мастацкага перакладу, тэарэтычнай, супастаўляльнай і камп'ютэрнай лінгвістыкі.

## ФАКУЛЬТЭТ ПРЫКЛАДНОЙ МАТЭМАТЫКІ І ІНФАРМАТЫКІ

г. Мінск,
пр. Ф. Скарыны, 4
Тэл.: 268-70-87

# ДЫПЛОМЫ ГЭТАГА ФАКУЛЬТЭТА ПРЫЗНАЮЦЦА ВА ЎСІМ СВЕЦЕ

Дата стварэння: 1 красавіка 1970 года.

Колькасць кафедраў: 11.

Колькасць студэнтаў: больш за тысячу.

Састаў выкладчыкаў: 15 прафесараў і дактароў навук, больш за 90 дацэнтаў і кандыдатаў навук.

На факультэце вядзецца падрыхтоўка спецыялістаў па наступных спецыяльнасцях: прыкладная матэматыка; інфарматыка; эканамічная кібернетыка; актуарная матэматыка.

Пасля дадатковай педагагічнай падрыхтоўкі і практыкі выпускнікі факультэта могуць працаваць выкладчыкамі матэматыкі і інфарматыкі.

На першым і другім курсах для студэнтаў усіх спецыяльнасцей выкладаюцца агульнаматэматычныя і агульнапраграмісцкія дысцыпліны (матэматычны аналіз, геаметрыя і алгебра, дыферэнцыяльныя ўраўненні, ЭВМ і праграміраванне, практыкум на ЭВМ і іншыя). Спецыялізацыя студэнтаў факультэта ў межах выбранай спецыяльнасці ажыццяўляецца з трэцяга курса.



*ДЭКАН ФАКУЛЬТЭТА ПРЫКЛАДНОЙ МАТЭМАТЫКІ І ІНФАРМАТЫКІ – ДАЦЭНТ **Павел Аляксеевіч МАНДРЫК***

Спецыяльнасць прыкладная матэматыка (кваліфікацыя "матэматык-праграміст") уключае наступныя спецыялізацыі: лікавыя метады, аптымізацыя і аптымальнае кіраванне, матэматычная фізіка, матэматычнае і праграмнае забеспячэнне праблемна арыентаваных сістэм, тэорыя імавернасцей і матэматычная статыстыка, матэматычнае забеспячэнне сістэм аўтаматызаванага праектавання і кіравання, даследаванне аперацый і сістэмны аналіз, матэматычнае і праграмнае забеспячэнне крыптаграфіі і аналізу дадзеных.

Асноўнымі відамі дзейнасці спецыялістаў гэтай кваліфікацыі з'яўляюцца стварэнне матэматычных мадэляў, алгарытмаў і праграм кіравання аб'ектамі і працэсамі, распрацоўка матэматычнага і праграмнага забеспячэння электроннай вылічальнай тэхнікі.

*(Заканчэнне на 19-й стар.).*

*(Заканчэнне. Пачатак на 18-й стар.).*

Спецыяльнасць інфарматыка (кваліфікацыя "матэматык. Сістэмны праграміст") уключае наступныя спецыялізацыі: праграмнае забеспячэнне вылічальных сістэм і сетак (сістэмнае праграміраванне); праграмнае забеспячэнне сістэм аўтаматызацыі; сістэмы штучнага інтэлекту; архітэктура вылічальных сістэм; арганізацыя, распрацоўка і праграмнае забеспячэнне інфармацыйных сістэм.

Асноўнымі відамі дзейнасці спецыялістаў гэтай кваліфікацыі з'яўляецца стварэнне матэматычных мадэляў і аўтаматызацыя праектавання складаных сістэм, распрацоўка сістэмнага праграмнага забеспячэння сродкаў вылічальнай тэхнікі.

Спецыяльнасць эканамічная кібернетыка (кваліфікацыя "матэматык-эканаміст") уключае наступныя спецыялізацыі: матэматычнае і праграмнае забеспячэнне камп'ютэрнага аналізу, мадэліравання і прагназіравання ў эканоміцы; матэматычнае і праграмнае забеспячэнне сістэм апрацоўкі эканамічнай інфармацыі.

Асноўнымі відамі дзейнасці спецыялістаў гэтай кваліфікацыі з'яўляецца матэматычнае мадэліраванне і аптымізацыя эканамічных працэсаў і сістэм; эканаметрычны аналіз і прагназіраванне ў эканоміцы і бізнесе; распрацоўка камп'ютэрных сістэм апрацоўкі інфармацыі і кіравання ў эканоміцы і бізнесе.

Спецыяльнасць актуарная матэматыка (кваліфікацыя "матэматык-фінансіст") уключае спецыялізацыі: матэматыка страхавання, фінансавая матэматыка.

Асноўнымі відамі дзейнасці спецыялістаў гэтай кваліфікацыі з'яўляюцца інвестыцыйны аналіз і кіраванне актывамі; агульнае страхаванне і страхаванне жыцця; пенсійнае забеспячэнне; дэмаграфічная статыстыка.

Пры факультэце прыкладной матэматыкі і інфарматыкі дзейнічае спецыяльны факультэт бізнесу і інфармацыйных тэхналогій, на якім студэнты 5-га курса маюць магчымасць дадаткова вывучыць фінансава-эканамічныя дысцыпліны і атрымаць другі дыплом дзяржаўнага ўзору аб перападрыхтоўцы па спецыяльнасці эканамічная кібернетыка з наданнем адпаведнай кваліфікацыі.

Студэнты займаюцца навуковай працай, удзельнічаюць у рашэнні актуальных прыкладных задач і распрацоўцы прыкладнога праграмнага забеспячэння.

## ХІМІЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ

г. Мінск,
вул. Ленінградская, 14
Тэл.: 226-49-98

# ВАЖНАЯ НАВУКА Ў СУЧАСНЫМ ПРЫРОДАЗНАЎСТВЕ

Хімічны факультэт заснаваны ў 1931 годзе і з'яўляецца сёння адзіным у рэспубліцы цэнтрам па падрыхтоўцы хімікаў з вышэйшай універсітэцкай адукацыяй. За гэтыя гады падрыхтавана больш за 5 тысяч высокакваліфікаваных спецыялістаў-хімікаў, якія ўнеслі і ўносяць значны ўклад у развіццё хімічных навук і хімічнай прамысловасці ў рэспубліцы, пасяхова працуюць у агульнаадукацыйных школах, тэхнікумах, вышэйшых навучальных установах.

На хімічным факультэце будзе ажыццяўляцца прыём 100 чалавек: на агульнае аддзяленне 60 чалавек, 15 на спецыялізацыю хімічная экалогія і 25 чалавек на спецыялізацыю хімія лекавых злучэнняў. Студэнты агульнага аддзялення змогуць атрымаць кваліфікацыю "хімік" альбо "хімік. Выкладчык хіміі" ў залежнасці ад іх выбару пасля I курса.

На факультэце дзейнічаюць 6 кафедраў: неарганічнай, аналітычнай, арганічнай хіміі і хіміі высокамалекулярных злучэнняў, фізічнай хіміі, радыяцыйнай хіміі і хімічнай тэхналогіі, агульнай хіміі і методыкі выкладання хіміі. На факультэце працуюць 2 акадэмікі НАН РБ і больш за 10 дактароў навук, амаль 90% усіх выкладчыкаў факультэта маюць навуковыя ступені. Пры кафедрах факультэта дзейнічае шэраг навукова-даследчых лабараторый, супрацоўнікі якіх прыцягваюцца да вядзення вучэбнага працэсу.

За пяцігадовы перыяд навучання на дзённым аддзяленні студэнты атрымліваюць шырокую агульнапрафесійную падрыхтоўку, якая забяспечваецца вывучэннем у шырокім аб'ёме такіх дысцыплін хімічнага цыкла, як аналітычная, арганічная, неарганічная, калоідная, квантавая, фізічная хімія, хімія высокамалекулярных злучэнняў, крышталяхімія, будова рэчыва, хімічная тэхналогія і мадэліраванне тэхналагічных працэсаў і іншыя. Універсітэцкая адукацыя забяспечвае і дастаткова глыбокую агульнагуманітарную падрыхтоўку спецыялістаў-хімікаў, якая ажыццяўляецца дзякуючы вывучэнню дысцыплін сацыяльна-гуманітарнага цыкла.

Падрыхтоўка па спецыялізацыі пачынаецца з IV курса.

Студэнты, якія рыхтуюцца да педагагічнай дзейнасці, вывучаюць шэраг дысцыплін псіхолага-педагагічнага цыкла і праходзяць педагагічную практыку. На стадыі спецыялізацыі студэнты праходзяць паглыбленую спецыяльную падрыхтоўку па кафедрах, вывучаюць цыкл спецыяльных дысцыплін, які забяспечвае атрыманне сучасных тэарэтычных ведаў у пэўнай галіне хіміі.



*ДЭКАН ХІМІЧНАГА ФАКУЛЬТЭТА – ПРАФЕСАР **Генадзь Аляксеевіч БРАНІЦКІ***

Студэнты праходзяць вытворчую практыку на базе прадпрыемстваў і НДІ рэспублікі. Лепшыя студэнты атрымліваюць рэкамендацыі для паступлення ў аспірантуру. Выпускнікі факультэта працуюць у навукова-даследчых установах альбо на прадпрыемствах электроннай, радыётэхнічнай і хімічнай прамысловасці, школах і ВНУ рэспублікі.

Пра тое, як праходзяць прыёмныя экзамены, пра патрабаванні, якія ставяцца да абітурыентаў, можна даведацца ў перыядычным рэспубліканскім выданні — часопісе для старшакласнікаў і абітурыентаў "Рэпетытар".

З 1995 года факультэт вядзе падрыхтоўку спецыялістаў для фармацэўтычнай прамысловасці рэспублікі.

## ЭКАНАМІЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ

г. Мінск,
вул. К. Маркса, 31
Тэл. 227-60-25

# САМЫ МАЛАДЫ, АЛЕ ЎЖО ПРЭСТЫЖНЫ

Эканамічны факультэт — самы малады факультэт універсітэта — створаны 1 сакавіка 1999 года. Ён працягвае больш чым 30-гадовую традыцыю падрыхтоўкі ў БДУ выкладчыкаў палітэканоміі для ВНУ і тэхнікумаў рэспублікі. Асноўны касцяк выкладчыкаў эканамічных навук — выкладчыкі БДУ. Новы факультэт будзе рыхтаваць спецыялістаў па трох накірунках: эканамічная тэорыя (кваліфікацыя “эканаміст. Выкладчык эканамічных дысцыплін”), менеджмент (кваліфікацыя “эканаміст-менеджэр”), эканоміка (кваліфікацыя “эканаміст-аналітык”).

Эканоміка — новая спецыяльнасць, а яе навучальны план аналагічны праграмам падрыхтоўкі эканамістаў у замежных універсітэтах і блізкі да расійскага стандарту. Яго адрознівае спалучэнне фундаментальнасці і глыбокіх сістэмных ведаў эканамічных з'яў з уменнем прымяняць эканамічныя веды на практыцы. БДУ не будзе рыхтаваць канкрэтна бухгалтараў ці заводскіх планавікоў (на гэтыя спецыяльнасці летась прынята амаль 8 тысяч школьнікаў), хаця, безумоўна, нашы выпускнікі змогуць працаваць і па такіх вузкіх эканамічных спецыяльнасцях. Задача БДУ — рыхтаваць эканамістаў-аналітыкаў для працы ў банках, страхавых кампаніях, бізнесе, міністэрствах і ведамствах на пасадах экспертаў, саветнікаў. З 3-га курса аналітыкі будуць спецыялізавацца па чатырох накірунках: эканоміка народнай гаспадаркі, эканоміка прадпрыемства, банкаўская і фінансавая эканоміка, эканоміка знешняга гандлю.

Сучасны эканаміст павінен цудоўна валодаць інструментарыем аналітычнай працы, г. зн. матэматычным апаратам, камп'ютэрна-інфармацыйнымі тэхналогіямі, статыстычнымі базамі дадзеных у Інтэрнэт — усяму гэтаму будуць навучаць на эканамічным факультэце. Спецыяльна для гэтага створана кафедра эканамічнай інфарматыкі і матэматычнай эканомікі, якая разам з дзвюма ўжо наяўнымі кафедрамі эканамічных навук і эканамічнай тэорыі стане ядром эканамічнага факультэта. Ужо ў новым навучальным годзе будуць арганізаваны і новыя кафедры — фінансавай і банкаўскай эканомікі, эканомікі знешняга гандлю, замежнай мовы. Для эканаміста на факультэце будзе вельмі шмат увагі надавацца вывучэнню англійскай як асноўнай мовы міжнародных эканамічных зносін, хаця, зразумела, для жадаючых будзе прадастаўлена дадаткова магчымасць вывучаць нямецкую як мову краін — нашых найважнейшых эканамічных партнёраў.



*ДЭКАН ЭКАНАМІЧНАГА ФАКУЛЬТЭТА – ПРАФЕСАР* ***Міхаіл Міхайлавіч КАВАЛЁЎ***



*Пасля аднаўлення былога корпуса фізічнага факультэта ў ім размяшчаецца рэктарат*

Нават самыя выдатныя тэарэтычныя веды не гарантуюць магчымасць выпускніку лёгка адаптавацца да практычнай працы. Таму будуць прадугледжаны вучэбныя і вытворчыя практыкі: па статыстыцы, фінансах, макра- і мікраэканоміцы як у дзяржаўных структурах, так і на лепшых айчынных і замежных прадпрыемствах, фірмах, банках. Такое ўзаемадзеянне з рэальным сектарам эканомікі дазволіць яшчэ задоўга да заканчэння універсітэта наладзіць кантакт і знайсці месца працы, якое найбольш адпавядае здольнасцям і характару выпускніка. Эканамісту сёння не цяжка знайсці працу, але мы ставім больш складаную задачу — дапамагчы нашым выпускнікам знайсці добрую, цікавую, высокааплатную работу. Гэтаксама, як і адабраць студэнтаў для навучання ў магістратуры і аспірантуры. Адным словам, гэта будзе элітны факультэт для здольных і энергічных выпускнікоў школ.


**БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ**

Заснавальнік газеты — БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ

*Газета зарэгістравана Дзяржаўным камітэтам Рэспублікі Беларусь па друку. Рэгістрацыйнае пасведчанне №149 ад 28 чэрвеня 1996 года.*

*Газета надрукавана ў Выдавецкім цэнтры Белдзяржуніверсітэта 220030, г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6*

*Ум. друк. арк. 1*

*Падпісана ў друк у 12.00*

*25 САКАВІКА*

*Зак. 237*

*Т. 1000 экз.*

*Адрас рэдакцыі: 220080, Мінск-80, Універсітэцкі гарадок, вул. Бабруйская, 7, паверх 4, пакой 411, тэлефон 2206827.*

**Рэдактар М. Г. ЗАГОРСКАЯ**

*Газета ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР*